PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 23 (2456) Год XLVIII | Беласток, 8 чэрвеня 2003 г. | Цана 2,00 зл.

Прэм'ер у Нараўцы

Мацей Халадоўскі

— Калі мы не ўвойдзем у Еўрасаюз, можа быць толькі горш, калі ўвойдзем — будзе лепш. Вядома, не адразу. Еўрасаюз гэта не дракон, які нас праглыне, і не залатая рыбка, якая здзейсніць кожнае наша жаданне. Але ўваход у Еўрасаюз азначае, што крок за крокам будзем будаваць лепшую гаспадарку, будзем лепш заспакойваць грамадскія патрэбы, будзем усё больш канкурэнтаздольнымі, — пераконваў жыхароў Нараўкі роўна на два тыдні да еўрасаюзнага рэферэндуму прэм'ер Лешак Мілер.

На сустрэчу з кіраўніком Рады Міністраў, лакальнымі і падляшскімі ўладамі ды парламентарыямі ад СЛД на пляц пад амфітэатрам у Нараўцы прыйшло пару соцень асоб. У патоках сонца прэм'ер дзяліўся сваімі роздумамі:

— Калі скажам „не" — сапхнемся на перыферыі Еўропы. Польскія вытворцы, якія ўжо сёння экспартуюць на патрабавальныя рынкі Заходняй Еўропы, не змогуць гэтага рабіць, бо кошты вытворчасці, з-за мытных бар'ер, пабольшацца. Зачынім дарогу развіцця маладым палякам, адсталасць нашай дзяржавы будзе ўзрастаць, пабольшае беспрацоўе. Не дагонім іншых. Астанемся адны. Што горшае, Літва, Латвія, Эстонія, Чэхія, Славакія і Венгрыя будуць у Еўрасаюзе, а мы будзем толькі на іх глядзець і ім зайздросціць.

Заклікаў:

— Я прашу вас вынесці такое рашэнне, каб ніколі за яго не саромецца, каб не шкадаваць, што мелі мы якуюсь перспектыву, вялікія шанцы, а ўсё гэта адплыло і ў чарговы раз у гісторыі мы штосьці праваронілі. Невядома, калі будзе наступнае пашырэнне ЕС. Невядома ці будзем прыняты, а калі нават і так, то на намнога горшых умовах.

Зараз пасля дадаў:

— Другога рэферэндуму можа не быць.

Адзін з жыхароў Нараўкі шчыра прызнаўся:

— Ведаю тутэйшых сялян. Бедныя яны. Я — за Еўрасаюз, але яны — супраць. Тут няшмат будзе за *Вуніяй*. Увесь наш гандаль ішоў за зачыненую ўжо ўсходнюю мяжу. Я хачу выкарыстаць нагоду і спытацца, чаму вы і ваш урад так намі два гады *жондзілі*!

Гэтае выступленне сабраныя ў амфітэатры ўспрынялі апладысментамі. Лешак Мілер адказаў:

— Уваход у ЕС азначае, што кожны, хто гаспадарыць на абшары большым за адзін гектар і штосьці прадукуе, атрымае непасрэдныя даплаты, якіх да гэтай пары не атрымліваў. Гэта будзе жы-

[працяг ☞ 3]

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Міністр Владзімеж Цімашэвіч на сваім пушчанскім падворку

У Еўропе аднолькавых шанцаў

З зуброўкай у Еўрасаюз

альбо Як міністр селяніна пераконваў

Мацей Халадоўскі

Месца падзеі: Белавежская пушча. Пасярод лясоў скрытыя два домікі. У цэнтры панадворка — драўляны стол. Кругом радасна трухаюць два цёмныя таксікі і пярэстая лайка. Падляшскі дэпутат, міністр замежных спраў і былы прэм'ер Владзімеж Цімашэвіч у каўбойскім капелюшы адпачывае тут і сустракае знаёмых. Як правіла, прыязджае сюды ў суботы. Толькі тады, і то час ад часу, удаецца яму адарвацца ад сусветных абавязкаў.

Каля паўгадзіны дарогі далей на ўскраіне Белавежы пры дарозе на лаўцы грэюцца на вясновым сонцы трое сялян. Найстарэйшаму будзе з семдзесят. Наймалодшы, на выгляд — саракагадовы. Сярэдні, найбольшы гаварун, смаліць папяросу з запасу ад сям'і з таго боку мяжы.

Праект на дзесяткі гадоў

— Нічога добрага тая Вунія не зробіць нашай Пушчы! — кідае зачэплены найстарэйшы мужчына.

Владзімеж Цімашэвіч прыгадвае:

— Два-тры гады таму я баяўся, што факт перанясення мяжы Еўрасаюза на ўсход можа абазначаць штосьці дрэннае для нашай пушчы. На гэтай еўрапейскай мяжы трэба ж устанаўліваць размаітае тэхнічнае абсталяванне з прычыны неабходнасці кантролю нелегальных пераходаў. Я апасаўся, што гэта магло б стаць прычынай, для прыкладу, высякання лесу.

Яшчэ ў лютым падляшскі міністр паказаў пушчанскую мяжу калегу з урада, міністру ўнутраных спраў Кшыштафу Яніку і паслам пятнаццаці краін Еўрасаюза:

— Нягледзячы на тое, што трымаў траскучы мароз, паказалі мы амбасадарам кудою прабягае мяжа, які гэта лес, каб нікому ў галаву не прыйшлі такія тэхнічныя патрабаванні. З беларускага боку ёсць заставы, платы, якія раздзяляюць пушчу, што з экалагічнага пункту гледжання не мае ніякага сэнсу. З другога боку, сёння дамагацца ад беларусаў дэмантажу таго ўсяго, асабліва цяпер, калі ўсе прыглядаюцца, як паспяхова будзем захоўваць мяжу Еўрасаюза, гэта, мабыць, не самая лепшая ідэя і трэба будзе з гэтым пачакаць.

Каля трохсот метраў ад хаты міністра відаць склады драўніны. Леснікі вылічаюць лясное „пустазелле": мяшанку вольхі і бярозы, самасейкі. Насаджваюць бракуючыя дубы і ясені.

— Найважнейшае для Пушчы — каб яе не руйнавалі, — адзначае міністр Цімашэвіч. — Справа ў тым, каб вярнуць ёй першабытны, натуральны характар. Пушча, пасля таго, што ў ёй тварылася ў XIX і XX стагоддзях, вельмі знішчаная. Лягчэй будзе яе аднавіць карыстаючыся еўрасаюзнымі сродкамі. ЕС надае агромнае значэнне справам аховы асяроддзя. Трэба было б сканструяваць адпаведны праект, менш-больш на 20-30 гадоў, пры саўдзеле гайнаўскага самаўрада, леснікоў з Дзяржаўных лясоў і навукоўцаў з Белавежскага нацыянальнага парку. Агулам неабходных будзе некалькі дзесяткаў мільёнаў еўра. Вядома, праект павінен мець падтрымку ўрада. Дарэчы, ён павінен ужо быць гатовы.

Што з беларускай Пушчай?

— Гэты праект павінен ахопліваць таксама беларускі бок. Аднак, да гэтага даўжэйшая дарога. Трэба пераканаць улады Беларусі, давесці да ўзгаднення экалагічнай палітыкі на розных узроў-

[працяг ☞ 3]

Акно ў свет Усходу ☞ 4

Пасол О'Рурк успомніў аб цяжкасцях, якія маюць і могуць мець гміны з выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў. Перш за ўсё звязаны яны з клопатамі з супольным фінансаваннем праектаў самімі гміннымі самаўрадамі. Адзначыў, што абавязкова супрацоўніцтва гмін з ваяводскім самаўрадам, найважнейшай установай пры апрацоўванні неабходнай палітыкі рэгіянальнага развою.

Шырокія магчымасці для Арэшкава ☞ 5

Для ўрачыстасці школа ў Арэшкаве была святочна прыбрана. Калідор на другім паверсе быў аздоблены хваркамі і ластаўкамі, а на першым паверсе былі звіты вярбовыя гнёзды з парай буслоў пры кожным. Упрыгожанне прыдумалі настаўніцы Генрыка Бліхаж і Бажэна Давідзюк.

Ласіняны ☞ 5

Калісь Ласіняны належалі прыходу ў Галынцы. З Галынкі бацюшка ішоў на Сёмуху з хрэсным ходам, свянціў жыта. Прыходзіў у вёску і тут усе каля капліччі маліліся. Насупраць капліччі выган быў і туды пераганялі жывіну. Гналі каля плота побач капліччі і адтуль бацюшка свянціў кароў і коней. Пасля ішоў праз вёску і свянціў усялякую ежу, якую людзі выстаўлялі на сталы перад сваімі хатамі.

Поспехі беларускіх хораў ☞ 9

Народны маладзёжнаы хор „Вяснянка" існуе з 1992 года пры Дзяржаўнай педагагічнай калегіі ў Гродне і выконвае, перш за ўсё свецкую музыку. Члены хору спяваюць сучасныя і народныя беларускія песні. Сярод царкоўных песень выконваюць класічныя творы і сучасную царкоўную музыку.

Бельскі шпіталь у калапсе ☞ 9

Фінансавыя абставіны шпіталя вельмі складаныя. У мінулым годзе дзейнасць шпіталя завяршылася дэфіцытам у 3 528 950 злотаў (годам раней дэфіцыт склаў 3 958 900 зл.); шпіталь задоўжаны на 7 576 910 злотаў.

У сваёй хаце гаспадар ☞ 11

Валянціна Кнут не магла ўседзець дома, чакаючы сына і мужа з разборкі. Урэшце рушыла пешшу з другім сынам Ігарам у бок гаспадаркі Рыся. Пад яго домам стаяў іхні трактар, а з шынаў валіў дым. Раптам з хаты выскачыў гаспадар, завішчаў і пачаў біць Ігара ў твар. Валянціна кінулася званіць на паліцыю.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

Наступ на незалежныя СМІ

У Беларусі працягваецца праследаванне назалежных сродкаў масавай інфармацыі. Апошнім часам гэтая бяда спасцігла „Белорусскую деловую газету" — незалежнае выданне заснаванае ў 1992 г. У канцы мая Міністэрства інфармацыі, на падставе рэкамендацыі Генеральнай пракуратуры, прыпыніла на тры месяцы выхад самой газеты і штомесячнага дадатку „БДГ. Для служебного пользования", спасылаючыся на парушэнне Закону аб друку. За апублікаванне апальных артыкулаў рэдакцыя атрымала тры папярэджанні, чаго дастаткова для прыняцця такой меры.

Першае папярэджанне было вынесенае за артыкул „Барский имидж" (18.04.2003 г.), у якім было апублікавана бліц-апытанне на тэму „ці мае права Аляксандр Лукашэнка адвольна распараджацца самалётам кіраўніка краіны?" Гэтае пытанне выклікала інтэрв'ю міс Расіі Святланы Каралёвай у расійскай газеце „Мегаполис-экспресс", у якім яна распавяла пра сваё знаёмства з Аляксандрам Лукашэнкам. Прыгажуня Расіі наведала Беларусь і прызналася, што Аляксандр Лукашэнка не адпусціў яе дадому на цягніку, толькі адправіў на прэзідэнцкім самалёце. У артыкуле прадстаўлены былі асабістыя меркаванні рэспандэнтаў. Міністэрства інфармацыі палічыла, што публікацыя ўводзіць чытачоў у зман і ганьбуе гонар і годнасць прэзідэнта. Другое папярэджанне „БДГ" атрымала за рэпартаж „Где леоновские миллионы?" (29.04.2003 г.) з адкрытага судовага пасяджэння па справе дырэктара Мінскага трактарнага завода Міхаіла Лявонава. І хаця аўтар рэпартажу мае афіцыйную акрэдытацыю пры Вярхоўным судзе, Міністэрства інфармацыі абвінавацела яго ў апублікаванні матэрыялаў крымінальнай справы без згоды суда. Трэцяй апальнай публікацыяй аказаўся матэрыял „Магический кристалл" у дадатку БДГ аб фінале спіртавога скандалу, які закончыўся пазбаўленнем волі кіраўніка прадпрыемства „Белхарчпрам" Віктара Казекі і яго сына Андрэя. Міністэрства лічыць, што ў публікацыі распаўсюджваюцца неверагодныя весткі, але не называе ніводнай з іх.

Міністр інфармацыі паведаміў, што ад пачатку года яго ведамства вынесла газетам 28 папярэджанняў (між іншым атрымалі іх „Народная воля" і „Вячэрні Столін"), а месяц таму прыпыніла на тры месяцы выхад „паскуднай" газеты „Навінкі". Больш складаная справа ў міністра з тэлеканаламі і радыёстанцыямі, асабліва з прамым эфірам, таму пры навелізацыі закона аб СМІ разглядаецца пытанне як вырашыць гэтыя складанасці.

Змаганне беларускіх улад са свабодай слова мае шматгадовую традыцыю. Пачалося яно ў 1994 г. з выхаду шэрагу газет з белымі плямамі, калі недазволена было надрукаваць даклад дэпутата Сяргея Антончыка аб карупцыі. Два гады пазней закрыта была незалежная радыёстанцыя „Радыё 101,2". У сакавіку 1997 г. карэспандэнт расійскага тэлеканала НТВ Аляксандр Ступнікаў быў пазбаўлены акрэдытацыі і высланы з Беларусі. У ліпені гэтага ж года акрэдытацыю страціў карэспандэнт ОРТ Павел Шарамет, а супраць яго ўзбуджана была справа за незаконнае перасячэнне мяжы. У 1997 г. закрыта была газета „Свабода", у 1999 г. — „Навіны", а ў 2001 г. — „Пагоня". Рэдактар і журналіст астатняй газеты былі асуджаны і пазбаўлены волі. Год таму закрыта была газета „Рабочы", а яе рэдактар „за паклёп на прэзідэнта" атрымаў турэмны тэрмін.

Становішча незалежных СМІ ў Беларусі выклікала таксама занепакоенасць расійскіх „Известий", якіх мінскі ўласны карэспандэнт таксама падвяргаецца ганенням за пазіцыю газеты. Афіцыйны Мінск здаецца не заўважаць, што такія адносіны да СМІ ў прыстойным грамадстве немагчымыя. На гэта звярнуў увагу старшыня камітэта АБСЕ па свабодзе прэсы Фрэймут Дуве ў звароце да міністра замежных спраў Сяргея Мартынава. Паводле яго, афіцыйныя асобы, у тым ліку прэзідэнт, не павінны карыстацца ніякай дадатковай абаронай ад крытыкі ў іх адрас. Наадварот, ім трэба быць больш цярплівымі да крытычных заўваг СМІ, чым звычайным грамадзянам. У пісьме прыпамінаецца, што Беларусь падпісала ўсе пагадненні АБСЕ па свабодзе прэсы.

(вл)

Інтэграцыйная прабуксоўка

Беларуска-расійскія дачыненні ўвайшлі ў чарговую стадыю незразумелага, на першы погляд, зацішша. З аднаго боку Масква робіць выгляд нібыта не заўважае самага галоўнага свайго саюзніка, а з другога — Мінск без гучных слоў пераўтварае ў нішто ранейшыя дамоўленасці.

У нядаўнім пасланні свайму парламенту, з якім час ад часу выступаюць кіраўнікі дзяржаў, Уладзімір Пуцін ані словам не ўпамянуў пра стасункі з краінай-сябрам адзінай Саюзнай дзяржавы — Беларуссю. Такое маўчанне набыло гучнасць гарматнага выбуху, прынамсі, сярод беларускага палітычнага Алімпа, як уладнага, так і апазіцыйнага. Беларускія палітыкі прапрэзідэнцкага атачэння, па ўсёй верагоднасці, адчулі сябе пакрыўджанымі такім забыццём, асабліва напярэдадні магчымага падпісання Канстытуцыйнага акту расійска-беларускага саюза. Апазіцыйным жа дзеячам такая няўвага да Беларусі здаецца як збанкрутаванасць у расійскіх вачах беларускага прэзідэнта і ягонай палітыкі.

Не ўсё ладна і ў эканамічных стасунках. Ужо каторы месяц буксуе прыняццё канчатковага рашэння па агульнай валюце. Бакі дагэтуль не могуць прыйсці да згоды ў існаванні адзінага эмісійнага цэнтра і хто ў ім сколькі будзе мець правоў. Са слоў старшыні беларускага Нацбанка Пятра Пракаповіча становіцца вядома, што адзіная валюта можа з'явіцца пазней 1 студзеня 2005 года — даты, гучна заяўленай абодвума прэзідэнтамі.

Прыватызацыя беларускай газанафтахіміі ўвогуле пераўтвараецца ў нешта смешнае. „Белтрансгаз" — прадпрыемства-манапаліст у продажы расійскага газу на тэрыторыі Беларусі мусіць быць пераўтворанае ў сумеснае расійска-беларускае акцыянернае прадпрыемства да 1 ліпеня гэтага года. Але гэта становіцца пад пытаннем з-за таго, што беларускі бок ніяк не пагаджаецца перадаць расійскаму „Газпраму" кантрольны, больш за 50%, пакет акцый. А на меншую долю згаджацца расіянам нявыгадна, бо ў адваротным выпадку цэны на газ спажыўцам у межах Беларусі будуць вызначаць не яны, а беларускі ўрад. Пры чым расіяне мусяць аплачваць яшчэ шэраг дадатковых жаданняў мясцовага кіраўніцтва, кшталту інвеставання ў рэканструкцыю газатранспартнай сістэмы Беларусі.

Расіяне ўсё настойлівей кажуць аб тым, што беларускі бок выстаўляе занадта высокія кошты акцый як у выпадку з „Белтрансгазам", так і з нафтаперапрацоўчымі прадпрыемствамі. І менавіта па гэтых прычынах аўкцыён па продажу апошніх аказаўся цалкам правалены, бо не знайшлося жадаючых набыць меней за 50% акцый па агромністых коштах прадпрыемстваў „Гродна Азот", „Гродна Хімвалакно", „Нафтан" і „Палімір". Расійскія купцы лічаць, што за прапануемыя цэны лягчэй пабудаваць новы нафтаперапрацоўчы комплекс. А прадпрыемствам тым часам як паветра патрэбна рэканструкцыя і абнаўленне асноўных фондаў.

Пакуль цяжка сказаць што менавіта, але, магчыма, сваю ролю адыгралі тут і вышэйпрыведзеныя беларуска-расійскія непаразуменні, прывяло да перанясення на нявызначаны тэрмін маючай адбыцца ў пачатку чэрвеня ў Магілёве сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Аляксандр Лукашэнка тым часам ганьбіць расійскую газету „Известия" за „нелюбоў да Беларусі", а рэйтынг Уладзіміра Пуціна сярод беларускага насельніцтва, згодна незалежных сацыёлагаў, імкліва расце.

Інтэграцыя, такім чынам, увайшла ў ступар, з якога яе, па ўсёй верагоднасці, раней ці пазней выведзе расійскі капітал. Бо, як бачна апошнім часам, кіраўніцтва Расіі вырашыла пашыраць палітычны ўплыў сваёй краіны на бліжэйшых суседзяў праз эканоміку, а не праз задавальненне палітычных інтарэсаў асобных персон з блізкага замежжа.

Уладзімір Лапцэвіч

Шматгадоваму бухгалтару **Ільі Агіевічу** і Яго сям'і
словы шчырага спачування з прычыны напаткаўшага Іх гора
— смерці Жонкі, Маці і Бабулі —
выказваюць супрацоўнікі і члены Грамадскага камітэта пабудовы
Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

„Рэпартаж з клеткі для трусоў"

Праблема аховы правоў чалавека вядомая ўсім тым, хто ўважліва чытае прэсу або глядзіць тэленавіны. Аднак у наш час у грамадстве перамагае абыякавасць да пакут другога чалавека. Каб змяніць адносіны да чужога няшчасця, Французкі фонд чалавечых правоў сарганізаваў перасоўны фільмавы фестываль „Правы чалавека ў фільме", які пасля візіту ў Любліне, Торуні і Чанстахове 14 мая завітаў у Беласток.

На працягу трох дзён студэнты, бо да іх адрасаваны быў гэты фестываль, мелі магчымасць пазнаёміцца з праблемамі жанчын Тэгерана, дзяцей Уганды і вайной у Чачні.

Вялікім зацікаўленнем карыстаўся фільм беларускага кінарэжысёра Віктара Дашука „Рэпартаж з клеткі для трусоў" пра Беларусь прэзідэнта Лукашэнкі. Рэжысёр ужо на самым пачатку сцвярджае, што „на Беларусі галоўным рэжысёрам, аўтарам і акцёрам ва ўсіх фільмах ёсць Лукашэнка, а іх тэма кранае толькі адну «праблему»: як народ кахае свайго прэзідэнта". Гледачы маюць магчымасць пабачыць як выглядаў марш свабоды ў Мінску ў 1999 г., Дзень Свабоды ў сакавіку 2000 г., калі спецпадраздзяленні арыштавалі тэлежурналістаў і аператараў. Фільм прадстаўляе таксама лёсы людзей, якія папалі ў канфлікт з уладай: Васіля Старавойтава, Тамары Віннікавай — былога дырэктара Нацбанка, Генадзя Карпенкі — навукоўца, які балатаваўся на прэзідэнцкіх выбарах, Юрыя Захаранкі — міністра ўнутраных спраў, які загінуў пасля заснавання апазіцыйнай партыі, Дзмітрыя Завадскага — тэлеаператара, які ў свой час працаваў у прэзідэнцкай камандзе...

„Рэпартаж..." спадабаўся, калі можна так сказаць, беластоцкім студэнтам якія, па словах прысутнага на спатканні Яўгена Вапы, не памятаюць падобных вобразаў, сітуацый, якія мелі месца дваццаць гадоў таму ў Польшчы. Каб палітычная сітуацыя Беларусі і беларусаў была лепш зразумелай для маладых людзей, арганізатары запрасілі на спатканне Марка Шымчука з Хельсінскага фонду, які займаецца супрацоўніцтвам з грамадскімі фондамі ў Беларусі і прадстаўнікоў гродзенскай „Ратушы" — няўрадавай арганізацыі, якой пагражае закрыццё.

„Ратуша" існуе сем гадоў, на працягу якіх займалася юрыдычнай дапамогай насельніцтву, падтрымкай грамадскіх ініцыятыў і выдавецкай дзейнасцю. Атрымаўшы два папярэджанні ад улад за нелегальную выдавецкую дзейнасць „Ратушы" згодна з існуючым у Беларусі законам пагражае закрыццё.

Андрэй Кусяльчук — адзін з прадстаўнікоў „Ратушы" — спаглядае аднак у будучыню з аптымізмам. „Будучыня нашага народа ў руках маладых людзей, якія сілу чэрпаюць з традыцыі нашай зямлі, мовы — якой нельга забываць! І хаця часта так здараецца, што бацькі — рускамоўныя, то дзеці імкнуцца да беларускасці — шукаюць сваіх каранёў і не з'яўляецца гэта толькі модай, а сапраўднай прагай пачуцця нацыянальнай прыналежнасці".

Паўліна Шафран

З зуброўкай у Еўрасаюз

[1 ☞ працяг]

нях. Трэба было б таксама пераканаць партнёраў з ЕС у тым, што такі праект, які будзе выходзіць па-за еўрасаюзныя межы — супольная справа. Гэта трэба зрабіць, асабліва цяпер, калі вядзецца дыскусія аб суадносінах пашыранага ЕС з яго партнёрамі, а асабліва аб еўрасаюзнай усходняй палітыцы. У час гэтых дыскусій будзем пераконваць, што варта гэтак думаць і аб іншых праектах, звязаных з экалогіяй і турызмам. Думаю, напрыклад, аб прадаўжэнні сплаўнасці Аўгустаўскага канала на беларускі бок, каб можна было прапанаваць усім у Еўропе турыстычны шлях, які б працягваўся па-за нашу мяжу.

Не трэба траціць

— То хай скажуць *перуч*, колькі мы на той *Вуніі* страцім! — патрабуе наймалодшы з лаўкі пад Белавежай.

Член урада Цімашэвіч:

— Сялян пераканае перш за ўсё вопыт. Людзі недаверлівыя. Нашы адносіны з іншымі дзяржавамі абцяжараны выпрабаваннямі і гістарычнымі ўспамінамі. Рэдка давялося нам сустракацца з бескарыслівай дапамогай і падтрымкай з боку іншых краін; хутчэй былі яны для нас пагрозай. Людзі не могуць зразумець, што супрацоўніцтва паміж краінамі не мусіць апірацца на прынцыпе, што калі хтосьці хоча выйграць, то іншы мусіць страціць. У еўрасаюзнай супольнасці ўсе могуць мець карысць адначасова. Сельскагаспадарчая палітыка ў ЕС зводзіцца да таго, што адны даплачваюць да іншых. Узніклі ў ЕС канцэпцыі, якія паказваюць на неабходнасць захавання грамадскай і гаспадарчай разнароднасці. Супольная сельскагаспадарчая палітыка накіроўваецца ў бок змен, вядучых да таго, каб падтрымка сельскай гаспадаркі не значыла ўзрост вытворчасці, але каб яна атрымала сацыяльны фактар, які дазваляў бы сялянам нармальна жыць ва ўмовах параўнальных з гарадскімі. Польскія сяляне аўтаматычна будуць трактавацца таксама.

Пад Белавежай адзін земляроб тушыць сваю папяросу:

— А датацыі то меншыя дастанем! І гэта мае быць справядлівасць?

У Пушчы міністр Цімашэвіч тлумачыць:

— Непасрэдныя датацыі ў рамках супольнай сельскагаспадарчай палітыкі паявіліся, калі больш за дзесяць гадоў таму дайшло да раптоўнага росту цэн харчоў. Справа ў тым, каб дарогай субвенцыявання прадукцыі магчы на рынку мець таннейшыя харчы і пабольшыць магчымасць іх экспарту па-за еўрасаюзны рынак. На пачатку нашых перамоў увогуле не хацелі нам даваць датацый, бо прычыны, якія іх выклікалі, у нас не выступаюць. Мы пераканалі, што ёсць і логіка супольнага рынку, канкурэнцыі, і нашы сяляне мусяць мець адпаведныя ўмовы дзеля канкурэнтнасці, бо не дадуць сабе рады. Ёсць у дыскусіях у Польшчы аб умовах для сельскай гаспадаркі пасля ўваходу ў ЕС шмат няведання альбо нядобрасумленнасці. Часта чуецца закід, што ў іх 100% даплат, а ў нас будзе намнога менш. Нельга параўноўваць кошты вядзення прадукцыйнай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы ў Польшчы і ў Заходняй Еўропе. Гэта справа спосабу ацэньвання рабочай сілы. Трэба гэта адносіць да сярэдняй зарплаты ў Польшчы, а не ў Францыі. Нашы сяляне не абцяжараны такімі самымі фінансавымі павіннасцямі. Не плацяць, як дагэтуль, нармальнага падаходнага падатку, а сімвалічны сельскагаспадарчы падатак. Нясуць некалькіпрацэнтны цяжар функцыянавання сельскіх пенсій, а не поўны. У выпадку падляшскай сельскай гаспадаркі, з прычыны яе кліматычных асаблівасцей і глебавых умоў, будзе яна прылічана да абшараў з цяжэйшымі ўмовамі сельскагаспадарчай прадукцыі. Гэта дае магчымасць экстра-даплат да кожнага гектара. У Капенгагене ўзровень тае падтрымкі ўстаноўлена на 1 250 еўра ў год.

Былы прэм'ер дадае:

— Незалежна ад таго, ці ты селянін, ці настаўнік, юрыст ці журналіст, то наша ваяводства будзе мець шанцы на гаспадарчы развой. Слабасць у нас — недаразвіццё інфраструктуры, асабліва ў транспарце. Праграмы еўрапейскай рэгіянальнай палітыкі канцэнтруюцца галоўным чынам на інфраструктурных праектах. У Польшчы няма сваіх сродкаў, каб прыспешыць тэмп гаспадарчага росту і развіцця інфраструктуры ва ўсходняй паласе, у тым на Падляшшы. І не збіраецца на серыю спектакулярных змен, якія з тыдня ў тыдзень, з месяца ў месяц прынясуць якасную рэвалюцыю. Аднак, не будзем мець таго ўсяго без членства ў Еўрасаюзе.

Наймалодшы з падбелавежскіх мужчын пытаецца з сумненнем:

— А што мы ім тут можам прапанаваць? У гарах то хоць асцыпак маюць.

— Ну, у нас, для прыкладу, зуброўка. Толькі што я няўпэўнены, ці дзесьці яе не падрабляюць. Чуў я, што ў ЗША прадаюць якуюсь зуброўку, што не паходзіць з Польшчы, прытым называецца „байзон", па-нашаму — „бізонаўка". Але ніхто не сфальсіфікуе нашай пушчанскай зуброўкі. Можа, такім таварам ёсць і бульбяная кішка. Гэта такая арыгінальная страва, што, пэўна, апрача нас ніхто яе не будзе вырабляць. У вачах маіх заграніччных гасцей, калі я іх частую кішкай, бачу здзіўленне, але, калі ўжо з'ядуць, дык хваляць!

За мудрую стратэгію

На лаўцы пад Белавежай найстарэйшы мужык уздыхае:

— Я ўжэ стары. Што мне па той *Вуніі*!

Владзімеж Цімашэвіч:

— Чым маладзейшыя нашы землякі, тым большыя могуць быць карысці. Калі б і я дайшоў да вываду, што з уваходу мае краіны ў ЕС не буду мець карысці, а будуць яе мець мае дзеці, то і гэтага аргумента хапала б дзеля падтрымкі нашай акцэсіі.

Старажыл дадае:

— А і так, хіба, Бог адзін ведае, калі ў гэтай Вуніі будзе лепш.

Міністр задумоўваецца над сталом на сваім пушчанскім панадворку:

— Узровень выкарыстання гэтага шанцу будзе залежаць ад умеласці абсорбцыі еўрасаюзных грошай. У большай ступені будзе гэта залежаць ад таго, ці зможам стварыць разумную стратэгію нашага членства, якая абмяжоўвае спісак абшараў з прыярытэтным значэннем. Справа ў тым, каб канцэнтраваць еўрапейскія сродкі на выбраных пытаннях, а не расцярушваць іх. Найперш павінны яны канцэнтравацца на развіцці інфраструктуры, а праз некалькі гадоў трэба зрабіць усё, каб канцэнтраваць іх на развіцці навуковага заплечча, на адукацыі. Ад таго залежыць тэмп развою Польшчы. Цяжка пераконваць пад ціскам часовых і лакальных патрэб, што супольная справа — сума лакальных спраў, інтарэсаў.

Над Пушчай змяркае. Падбелавежскія земляробы разыходзяцца ўпраўляцца. Міністр Цімашэвіч хаваецца ў сваёй пушчанскай хаце ад куслівай камарні, хоць робіць выгляд, быццам да яе ўжо прывык.

Кажуць у ваколіцы: Там, дзе камары, там і жабы. Дзе жабы — там і буслы. А дзе буслы — там і людзі, бо ж буслы дзяцей прыносяць. А кажуць не толькі наўкол Пушчы: людзі ўсюды хочуць жыць лепш.

Мацей Халадоўскі

12 конкурснае пытанне

Якой рэгіянальнай стравай частуе сваіх заграніччных гасцей міністр Владзімеж Цімашэвіч?

Адказ: .....

Імя і прозвішча: .....

Адрас: .....

(Каб правільна адказаць на пытанне трэба ўважліва прачытаць надрукаваны побач артыкул. Адказы просім дасылаць на гэтым талоне на адрас рэдакцыі. Тэрмін дасылання адказаў — да 15 чэрвеня 2003 г.)

Узнагароды...

... за правільны адказ на ***9-е конкурснае пытанне*** атрымоўваюць: **Марк Рэдзімскі** з Гдыні, **Анжаліна Сельвясюк** з Бельска-Падляшскага і **Лявон Федарук** з Рыбалаў.

У Еўропе аднолькавых шанцаў

У рамках праекта „У Еўропе аднолькавых шанцаў" друкуем апошні тэкст з цыкла 12 артыкулаў, прысвечаных нацыянальным меншасцям у краінах Еўрапейскага Саюза і Польшчы. Да артыкула прыкладзена конкурснае пытанне. Аўтары правільных адказаў возьмуць удзел у штотыднёвай жараб'ёўцы трох кніжных узнагарод, а на канец праекта — галоўнага прызу: набору дапаможнікаў для вывучэння англійскай мовы. Спонсарам праекта з'яўляецца Управа Камітэта еўрапейскай інтэграцыі.

Projekt wydawniczy zrealizowano przy współpracy z Urzędem Komitetu Integracji Europejskiej w ramach konkursu otwartego dla mediów-2003.

Прэм'ер у Нараўцы

[1 ☞ працяг]

вы грош, які трапіць непасрэдна ў кожную кішэню. Што лепш — атрымліваць штосьці, ці не атрымліваць? Адказ вельмі просты.

Што тычыцца ацэнкі двухгадовай дзейнасці ўрада, яго прэм'ер адказаў:

— Калі сустрэнемся праз наступныя два гады, будзеце мець права ацаніць гэтую кадэнцыю. Тое, на што мы прыйшлі, было намнога горшым, чым спадзяваліся. Мусім найперш канцэнтравацца на стабілізацыі публічных фінансаў. Таму, каб Польшча не апынулася на ўскраіне цалкавітага ўпадку. Цяпер паволі ўзрастае валавы ўнутраны прадукт, беспрацоўе пачынае памалу ад трох месяцаў паменшвацца. Эканамічныя вынікі прадказваюць лепшае.

На іншыя пытанні, якія датычылі шанцаў развіцця турызму ў рэгіёне, шэф урада адказваў:

— Калі спадзяецеся, што тут будзе больш турыстаў, то прыедуць яны тады, калі Польшча будзе ў межах ЕС, калі будуць правілы аднолькавыя як і ў Еўрасаюзе, калі будуць умовы, да якіх тыя турысты прывыклі. Калі Польшча не будзе ў ЕС, ніхто сюды не прыедзе. Будзеце асуджаны выключна на саміх сябе.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

На канец аднагадзіннай сустрэчы ў Нараўцы беларускі хор адспяваў прэм'еру „Многая лета". Пасля Лешак Мілер адкрыў новую прадукцыйную лінію ў беластоцкім прадпрыемстве „Biazet". На фабрычным фэсце меў ён нагоду сустрэцца з беластачанамі, але па невядомых прычынах гэтак не сталася.

Раней, калі ў Нараўцы працягвалася сустрэча з прэм'ерам Мілерам, у Нарве мясцовыя дускутавалі ў камерным коле з галандскім дэпутаваным у еўрапейскі парламент, селянінам Янам Мудлерам. Пераконваў ён, што не толькі польскія, але і галандскія жыхары вёскі баяцца ўваходу нашай краіны ў Еўрасаюз.

Мацей Халадоўскі

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Меншасці і Еўрасаюз

„Спаткаймася” — пад такой назвай у Супраслі на працягу чатырох дзён праходзіла канферэнцыя арганізаваная Расійскім культурна-адукацыйным таварыствам і Таварыствам „Малады цэнтр”. Спатканне было прысвечана маладзёжным арганізацыям нацыянальных і этнічных меншасцей напярэдадні далучэння Польшчы да Еўрасаюза.

Мерапрыемства „Спаткаймася” мела быць месцам дыялогу моладзі (студэнтаў, вучняў сярэдніх школ, як і прафесійна занятых маладых людзей) — прадстаўнікоў меншасцей, якія ад вякоў пражываюць на тэрыторыі краіны, і польскай моладзі. І гэтая задума арганізатараў атрымалася. У Супраслі спаткаліся палякі, беларусы, армяне, татары, рускія, а сярод іх — атэісты, каталікі і праваслаўныя.

Канферэнцыя дазволіла ўдзельнікам атрымаць шэраг інфармацый не толькі аб гісторыі кожнай з меншасцей, але і аб сучасных, супольных праблемах і спосабах іх вырашання. Пасля 1989 года ў Польшчы становішча меншасцей рашуча змянілася. З аднаго боку дазволіла на свабоднае, публічнае выяўленне свайго паходжання, а з другога боку выклікала шэраг новых праблем. Найлепшым прыкладам гэтаму з'яўляецца адсутнасць Закону аб нацыянальных і этнічных меншасцях (працы над якім працягваюцца 13 гадоў!).

Уваход Польшчы ў еўрасаюзныя структуры выклікае страх перад невядомым. І няма чаму здзіўляцца. Хаця з кожнага боку інфармуюць нас аб станоўчых баках інтэграцыйнага працэсу, не развейвае гэта ўсіх сумненняў, напрыклад, дзе месца меншасцям у такой сітуацыі?

Адказаць на гэтае і падобныя пытанні імкнуўся прафесар Андрэй Садоўскі — дырэктар Інстытута сацыялогіі Універсітэта ў Беластоку, які пераконваў удзельнікаў у тым, што шматкультурнасць і этна-нацыянальная і канфесійная разнароднасць Падляшша з'яўляецца вялікім шанцам для жыхароў нашага рэгіёна. Аднак перасцерагаў перад стэрэатыпным падыходам большасці палітыкаў, якія бачаць меншасці як тых, „якія чагосьці заўсёды патрабуюць і непатрэбна наракаюць”, бо такая сітуацыя даводзіць да непатрэбных канфліктаў.

Мешаныя сужонствы, неталерантнасць старэйшага пакалення, пошукі сваіх каранёў у свеце здамінаваным камп'ютэрамі, тэлебачаннем былі тэмамі даклада прафесара Ежы Нікітаровіча — дэкана Факультэта педагогікі і псіхалогіі Універсітэта ў Беластоку, які будучыню бачыць у руках свядомых свайго паходжання маладых людзей.

Вялікім зацікаўленнем карысталіся даклады прадстаўнікоў Праваслаўнай царквы і Каталіцкага касцёла. Андрэй Кузьма гаварыў аб станоўчых адносінах Праваслаўнай царквы да Еўрасаюза, доказам чаму ёсць падтрымка стараннням Польшчы дадзеная Саборам епіскапаў у 2000 годзе. Адносіны Каталіцкага касцёла прадставіў кс. Міхал Чайкоўскі.

Удзельнікі канферэнцыі атрымалі ад Агнешкі Басягі з Дэпартамента веравызнанняў і нацыянальных меншасцей МУСіА адказы на пытанні, да якіх органаў меншасныя арганізацыі могуць звяртацца за дафінансаваннем, якія ўстановы займаюцца праблемамі нацыянальных і этнічных меншасцей і як можна пакарыстацца замежнымі фондамі.

Канферэнцыі „Спаткаймася” спадарожнічалі гарачыя дыскусіі вакол інтэграцыі з Еўрасаюзам і сітуацыі, у якой апынуцца меншасці. Маладыя прадстаўнікі нацыянальных меншасцей з аптымізмам спаглядаюць у будучыню.

Паўліна Шафран

Вачыма паляка

Новыя шанцы кааператыўшчыкаў

Неяк ніколі не было ў мяне даверу да дзейнасці майго жыллёвага кааператыва. Я ягоны такі пасіўны член, што і не ходзіць на агульны сход ні на ніякі іншы, а любіць панаракаць на хібы ў яго дзейнасці. Штосьці, аднак, ува мне страпянулася, калі трапіў я ў Беластоку на сустрэчу шэфаў падляшскіх разнамасных кааператываў (харчавікоў, малочных пераапрацоўшчыкаў, жыллёвых, банкавых, сялянскай самапомачы і г.д.). Выслухаў дыскусію, а перш за ўсё Ежы Янкоўскага, старшыню Краёвай кааператыўнай рады. Паведаміў ён, што ў Канцылярыі прэзідэнта Кваснеўскага складзены ўжо новы праект закона аб кааператыўным праве. Згодна з ім, напрыклад, жыллёвыя кааператывы змогуць паклікаць менеджэрскія ўправы, а наглядальныя рады абмяжуюцца толькі да кантрольных функцый. Тады, можа, пазбудуся пераканання аб кааператыўных рэспубліках панібратоў. Мае ўжо не быць так, што кааператыў плаціць падатак, і тое ж самае — яго члены. Што важнае, калі шэфы захочуць узяць крэдыт на нейкую інвестыцыю, якая будзе мяне датычыць непасрэдна, мусяць запытацца згоды ў мяне і іншых зацікаўленых членаў. У дадатак — пісьмова. Апрача таго ў праекце новага закона знайшоўся біч на кааператыўныя круцельствы і няўдачніцтва. Калі хтосьці з управы, для прыкладу, старшыня, давядзе кааператыў да ліквідацыі або яго стратаў, будзе пагражаць яму дзесяць гадоў зняволення. Прысутным на сходзе прэзасам, здаецца, гэткая ідэя не вельмі спадабалася. Мне, звычайнаму члену — так. Вядома, кожны іншы член кааператыва разумее, чаму.

Ёсць таксама аптымістычная вестка для людзей, якія застаюцца без працы. Будуць яны магчы засноўваць кааператывы любога напрамку са сродкаў на актыўнае супрацьдзеянне беспрацоўю, з г.зв. асабістым выконваннем працы і непадзельнай маёмасцю. Хоць, пэўна, не кожнаму гэта спадабаецца, але на гэтым прынцыпе можна будзе, пасля таго як закон увойдзе ў сілу, весці агенцтвы „бюро знаёмстваў” — словам, секс-сервіз. Вядома, пры ўмове асабістага, узаемнага слугавання гэтымі „кампанейскімі” кааператыўнымі паслугамі. На падобных прынцыпах пенсіянеры змогуць засноўваць сацыяльныя кааператывы (напр. дамы спакойнай старасці).

У сувязі з уваходам Польшчы ў Еўрасаюз для кааператываў засвеціць таксама залёнае святло. Зможам прыняць Статут еўрапейскай кааператыўнасці. Згодна з ім, магчыма будзе весці трансгранічныя кааператывы, хоць бы польска-беларускія. Вядома, не будуць яны дзейнічаць на тэрыторыі Беларусі, пакуль гэтая краіна не член ЕС, але яе грамадзяне могуць быць членамі такога кааператыва, у рамках яго дзейнасці на тэрыторыі Польшчы. Так сабе ўяўляю, што пасля ўстанаўлення еўрасаюзнай мяжы ў нашым рэгіёне, такая форма гаспадарчай дзейнасці магла б спалучаць сем'і і сяброў па абодвух баках мяжы. Мабыць, гэта была б найбольш паспяховая і найбольш бяспечная форма заробкаў, а адначасова фінансавай дапамогі для беларусаў з таго боку мяжы, якая не можа стаць новай жалезнай заслонай.

Варта таксама ведаць, што кааператыў больш „бяспечны” чым суполка. Члены не нясуць у ім адказнасці за цэласць функцыянавання, а толькі за тую частку, якая ёсць іх удзелам. Так, вось, прыслухоўваючыся расповедам старшыні Янкоўскага ў Беластоку, азвалася ўва мне надзея, што, ужываючы нашага, тутэйшага сфармулявання, што калі б што, дык можна было б заснаваць кааператыў. „Давайце падзейнічаем!”

У сувязі з гэтай аптымістычнай надзеяй, перад тым каб аддаць голас у еўрасаюзным рэферэндуме, уздымаю тост. Кулну сабе маслянкі з гайнаўскага малочнага кааператыва. З тых літравых, у фольгавых мяшках, у Беластоку яна самая танная.

Мацей Халадоўскі

Акно ў свет Усходу

Падляшскія гміны добра выкарыстоўвалі да гэтай пары перадуваходныя грошы, — запэўніваў у Беластоку пасол Джон О'Рурк, першы саветнік і каардынатар праграм PHARE і ISPA ў Прадстаўніцтве еўрапейскай камісіі ў Варшаве.

Наведаў ён пабудову тунеля пад пуцямі ў Беластоку і мадэрнізаваны Аўгустаўскі канал. Абодва мерапрыемствы фінансуюцца з еўрасаюзных грошай. Раней, чыста валодаючы польскай мовай, паходзячы з Ірландыі пасол сустрэўся з ваяводам, самаўрадавымі ўладамі і прадпрымальнікамі. Пры нагодзе падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі заявіў, што пасля ўваходу Польшчы ў ЕС на патрэбы нашага ваяводства будзе забяспечаных больш за 600 мільёнаў еўра. Колькі ўдасца ўшчыкнуць з гэтай сумы, залежыць ад таго, ці выпаўнім усе еўрасаюзныя патрабаванні.

Пасол О'Рурк успомніў аб цяжкасцях, якія маюць і могуць мець гміны з выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў. Перш за ўсё звязаны яны з клопатамі з супольным фінансаваннем праектаў самімі гміннымі самаўрадамі. Адзначыў, што неабходнае супрацоўніцтва гмін з ваяводскім самаўрадам — найважнейшай установай пры апрацоўванні неабходнай палітыкі рэгіянальнага развою. Пераконваў, каб у хадайнічанні за еўрасаюзныя грошы не расцярушваць свае ўвагі на малаважныя мэты, а выбраць, для прыкладу, некалькі стратэгічных мэт, сур'ёзных мерапрыемстваў і старацца ў іх інвеставаць. Прытым публічная ўлада павінна даць адпор розным групам лобі, націску, і асцерагацца немерытарычных выбараў, якіх асновай могуць быць знаёмствы ці палітычны ключ.

— Стратэгія развою мае служыць аб'ектыўным і празрыстым выбарам праектаў, — тлумачыў пасол. — Публічныя кансультацыі не могуць быць толькі фармальнасцю.

Звярнуў ён таксама ўвагу на тое, што публічная адміністрацыя павінна быць кампетэнтнай, незалежнай, непалітычнай, а стабільнай, асабліва тая сярэдняга і ніжэйшага ўзроўню і нядобра, калі яна мяняецца пасля чарговых выбараў.

Джон О'Рурк звярнуў увагу на тое, што вялікі шанц Падляшша — пашырэнне ЕС на Прыбалтыку. Лакальныя ўлады павінны зацікавіцца магчымасцю наладжання шчыльнейшых сувязей з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй. Дадаў:

— Разлічваю на тое, што Польшча, у якой карані ёсць з усходняга боку свае мяжы, будзе весці палітыку ў адносінах да суседніх краін. Справа не толькі ў фінансавай падтрымцы тым краінам, але інтэграцыі шляхам стварання адналітага рынку. Мяжа Польшчы будзе акном у свет для ўсходу, які для Еўрасаюза застаецца важным.

Адказваючы на адно з пытанняў Анджэя Парафінюка з Падляшскага агенцтва рэгіянальнага развою, пасол сказаў:

— Трэба стварыць умовы, каб банкі цікавіліся крэдытаваннем малых і сярэдніх прадпрыемстваў і індывідуальных сялян. Крэдыты павінны атрымлівацца лягчэй, у сітуацыі недахопу дастатковых уласных сродкаў.

(холм)

Шырокія магчымасці для Арэшкава

13 мая г.г. у Пачатковай школе ў Арэшкаве адбылося ўрачыстае адкрыццё камп'ютэрна-інтэрнэтавага кабінета. Установа атрымала шэсць камп'ютэраў фундаваных фірмай „Alcatel" і прызначаных школе прэзідэнтам РП. Ва ўрачыстасці прынялі ўдзел прадстаўнікі Канцылярыі прэзідэнта, Кураторыі, спонсара, Гміннай управы і школ з Гайнаўскай гміны ды некаторыя бацькі. Пасля выступленняў паасобных гасцей і разрэзання стужкі адбылося набажэнства і мастацкая частка на польскай і беларускай мовах.

Для ўрачыстасці школа ў Арэшкаве была святочна прыбрана. Калідор на другім паверсе быў аздоблены хмаркамі і ластаўкамі, а на першым паверсе былі звіты вярбовыя гнёзды з парай буслоў пры кожным. Упрыгожанне прыдумалі настаўніцы Генрыка Бліхаж і Бажэна Давідзюк, а ў яго выкананні ўдзельнічалі дзеці.

Урачыстасць у гімнастычнай зале адкрыла дырэктар школы Гражына Бэрэзняк, сардэчна вітаючы гасцей, якіх папрасіла ўзяць голас.

Міхал Чога, саветнік у Канцылярыі прэзідэнта, зачытаў ліст да настаўнікаў і вучняў Пачатковай школы ў Арэшкаве, у якім прэзідэнт Рэчы Паспалітай Аляксандр Кваснеўскі напісаў: „Я перакананы, што здадзены сёння ў карыстанне кабінет будзе поўнасцю выкарыстаны. Сёння камп'ютэры і Інтэрнэт адкрываюць шырокія магчымасці ўзаемасувязі, аблягчаюць здабыванне інфармацыі, дазваляюць развіваць зацікаўленні. Новы кабінет узбагаціць ваша навучанне, прыгатуе кожнага з вас да працы і жыцця, дзе карыстанне камп'ютэрам стала неабходнасцю. Жадаю, каб збыліся вашы мары і надзеі. Сардэчна віншую настаўнікаў. Хай камп'ютэрны кабінет добра вам служыць".

Раман Садоўскі, прадстаўнік спонсара — фірмы „Alcatel", падкрэсліў: „Варта кіравацца ў такія мясцовасці як Арэшкава, а візіт у гэтай школе пераконвае, што яе выбар быў слушны, бо камп'ютэры тут вельмі патрэбныя. Спадзяюся, што кабінет будзе служыць доўгія гады, а новыя магчымасці прыдадуцца вам у будучыні".

Намесніца куратара падзякавала войту Гайнаўскай гміны Вользе Рыгаровіч за падгатоўку школы і настаўнікаў і за стварэнне ўмоў для перадачы каштоўнага абсталявання школе. Найбольшую падзяку скіравала яна Канцылярыі прэзідэнта і спонсару. Дзякуючы ім, — падкрэсліла, — малыя школы маюць шансы выпускаць мудрых людзей, якія ў будучыні змогуць нас падмяніць.

Войт Вольга Рыгаровіч сардэчна падзякавала прэзідэнту і яго саветніку: „Дзякуем, што дацанілі нас, убачылі нашу вёсачку на ўскраіне пушчы, нашу невялікую школку. Мы вельмі рады, што ў Польшчы ёсць яшчэ такія шляхетныя людзі, бо пачуць можна, што з прагрэсам убывае высакароднасць. Дацэньваем, што бачыць нас Варшава, і я гарантую, што гэтыя камп'ютэры будзем берагчы як зрэнку вока. Я прыкладу ўсе намаганні, каб дзеці імі поўнасцю карысталіся".

Дырэктар Гражына Бэрэзняк падзякавала за ветлівыя словы і папрасіла разрэзаць стужку. Пасля гэтага акта арэшкаўскі настаяцель Лявон Анхім адслужыў малебен у суправаджэнні школьнага хору пад рэгентурай Бэаты Маркевіч.

Мастацкую частку вучні нарыхтавалі пад кіраўніцтвам дырэктар Гражыны Бэрэзняк. Вялі мерапрыемства Паўліна Чурак і Кацярына Дунда з VI класа ды Марцін Мішчук з V класа. Магдаліна Дэмянюк і Маргарыта Анхім з нулявога класа праспявалі па песенцы. Трэцякласнік Пётр Герасімюк захапляльна прадэкламаваў верш Віктара Шведа „Не думай ніколі, што ўмееш даволі". Мастацкую частку закончылі вучні II і III класаў танцам горцаў „Траяк".

Урачыстасць у Арэшкаве была выдатна падрыхтавана і прайшла ўзнёсла. Было відаць, што дырэктар Гражына Бэрэзняк уклала ў гэта многа сваёй працы і сэрца.

Міхал Мінцэвіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Старшыня Анджэй Баўман (стаіць)

Як жыць і лечыцца

У час Агульнапольскага з'езда Польскага саюза дыябетыкаў, які 9 і 10 мая адбыўся ў Гайнаўцы, яго члены выказаліся за ўвядзенне еўрасаюзных стандартаў у лячэнні цукровай хваробы. Удзельнікі з'езда ацанілі, што ў Еўрасаюзе лягчэйшы доступ да спецыялістаў, якія лечаць цукровую хваробу, таннейшыя лякарствы і шырэйшая адукацыя хворых. Гайнаўскае спатканне адбывалася ў рамках святкавання Еўрапейскага года інвалідаў. У з'ездзе прынялі ўдзел вядомыя лекары і спецыялісты па цукровай хваробе ды пад 200 хворых.

Старшыня Польскага саюза дыябетыкаў Анджэй Баўман паінфармаваў, што лячэнне цукровай хваробы ў лекараў падставовай апекі часта даводзіць да ўскладненняў, якія могуць закончыцца стратай зроку або ампутацыяй ног. У асоб, якія не лечацца ў дыябетолагаў могуць часцей паяўляцца клопаты з працай сэрца і нырак. Блізка 30% з ліку 2 мільёнаў дыябетыкаў у Польшчы — інваліды. Некаторыя з іх не бачаць або страцілі ногі. Удзельнікі з'езда звярнулі ўвагу на патрэбу хутчэйшага прыстасавання многіх публічных будынкаў для патрэб калек. У час дакладаў сабраныя маглі даведацца пра лячэнне цукровай хваробы. Дакладчыкі інфармавалі аб прафілактычных дзеяннях, якія могуць ад яе зберагчы. Сабраныя патрабавалі роўнага доступу да працы. Старшыня праўлення Польскага саюза дыябетыкаў А. Баўман выказаў заклапочанасць па прычыне праекта ліквідацыі Дзяржаўнага фонду рэабілітацыі калек. Паводле старшыні, ліквідацыя Фонду выкліча ўвальненні з працы інвалідаў, ліквідацыю тэрапійных варштатаў і скарачэнне сродкаў на рэабілітацыю калек.

У час мерапрыемства заслужаныя лекары атрымалі адзнакі і ўзнагароды. З'езд закончыўся мастацкай праграмай у выкананні гайнаўскіх школьнікаў.

Аляксей Мароз

Ласіняны

Сёння ў Ласінянах пражывае каля пятнаццаці душ. Наймалодшай з іх — шэсцьдзесят адзін год. Пра састарэласць вёскі сведчыць нават заржавелы да нечытабельнасці дарожны паказальнік з назвай мясцовасці. Здзіўляе тут спартыўная пляцоўка пры першай ад Крушынян хаце, але гэта дзедка пабудаваў яе прыязджаючым да яго на канікулы ўнукам. А ўсё апошняе маркотна глядзіць у сумную тамашнюю будучыню.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

На вулічным узгорку стаіць мураваная праваслаўная каплічка, пабудаваная, як сказалі мне вяскоўцы, „пры цары Мікалаі"...

На ўзгорку хацелі людзі змураваць свіран і ў ім трымаць збожжа, каб на прадвесні дзяліць яго паміж найбяднейшымі вяскоўцамі. Назапасілі цэглу і трымалі іх у аднаго гаспадара, а ён узяў і тыя цэглы амаль усе прапіў. З тае рэшткі, што асталася, майстар з Кулёў паставіў каплічку. Паставілі яе перад панскім полем, каб жывіна ў панскае не лезла.

Калісь Ласіняны належалі прыходу ў Галынцы. З Галынкі бацюшка ішоў на Сёмуху з хрэсным ходам, свянціў жыта. Прыходзіў у вёску і тут усе каля каплічкі маліліся. Насупраць каплічкі выган быў і туды пераганялі жывіну. Гналі каля плота побач каплічкі і адтуль бацюшка свянціў кароў і коней. Пасля ішоў праз вёску і свянціў усялякую ежу, якую людзі выстаўлялі на сталы перад сваімі хатамі. Пасху тады вазілі свянціць у царкву, на ўсяночную; пасля службы яе бацюшка свянціў.

Калі немец вайною ішоў, спаліў вялікую драўляную галынскую царкву. Пасля вайны на захад ад Ласінян пралягла дзяржаўная граніца. Крынкі і Крушыняны апынуліся на польскім баку, а вёскі з заходняга ўзбярэжжа ракі Свіслачы апынуліся ў Савецкім Саюзе. У 1948 годзе граніцу перанеслі на Свіслач і такім чынам Ласіняны апынуліся ў Польшчы. Дзяржаўная мяжа аддзяліла вёску ад прыхода ў Галынцы.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Сёння ласіняне не возяць пасху ў царкву, а выносяць да свае каплічкі, куды прыязджае бацюшка з Крушынян. Калісь пад каплічку выводзілі і пакойнікаў, бо яна недалёка канца вёскі ад Галынкі. Сёння прыхадскі цэнтр з другога боку і для вываду пакойнікаў вяскоўцы паставілі крыж у агародчыку крайняй ад Крушынян хаты.

Старую каплічку жыхары Ласінян адрамантавалі які дзесятак гадоў таму, бо распадалася. Звязалі дротам, абтынкавалі, перакрылі. Хто ведае, ці не быў гэта апошні яе рамонт. Калісь у Ласінянах было каля дзевяноста коней, а сёння толькі два кані і тры трактары...

Аляксандр Вярбіцкі

Зорка

старонка для дзяцей

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

„Дзяцінства” з Барысава

У час XXII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі, які з 20 па 25 мая г.г. праходзіў у Беластоку, выступіў маладзёжны хор „Дзяцінства” з Беларусі. Харысты прыехалі з Барысава, раённага горада ў Мінскай вобласці. У рэпертуары маюць яны тры беларускія кампазіцыі, у тым ліку твор Міколы Равенскага.

У „Дзяцінстве” спяваюць навучэнцы Сярэдняй мастацкай школы. Хор існуе сем гадоў і мае на сваім творчым рахунку важкія поспехі — ужо два разы стаў лаўрэатам Фестывалю.

Калектывам кіруе Эльзара Войтка — педагог і выкладчык вакалістыкі.

„Дзяцінства” з Барысава захапіла ўсіх — і публіку, і журы Фестывалю. Дзіцячыя галасы цудоўна спалучаюцца з рэлігійнымі песнямі, уражваюць шчырасцю, мілагучнасцю.

— Як тыя анёлы з яснага неба! — каментавалі выступленне гасцей мае суседкі.

Міжнароднае журы ў саставе Рамуальд Твардоўскі (Польшча), Дымітр Дымітраў (Балгарыя), Віктар Роўда (Беларусь), Ігар Цыклінскі (Украіна), Ян Лукашэўскі (Польшча) прызначылі „Дзяцінству” вылучэнне.

XXII Фестываль царкоўнай музыкі праходзіў пад артыстычным патранатам сусветнай вядомасці кампазітара Кшыштафа Пендэрэцкага.

Зорка

Чатырохлістая канюшынка

Паслухай мяне,
чатырохлістая канюшынка ў траве.
Гаворыць цяпер
я не патраплю.
Бо калі губы нашы злучыліся,
мушу яму гаварыць:
Мой мілы.

Эмілія Антасюк

Вясна

Па вялікай ільдзіне
высокай да неба
сышла да нас
вясна.

Моры, лясы перайшла,
зоркі, сонца пазнала,
вецер, дождж сабрала.
І ў сад зайшла.

Аня Артэмюк, Парцава

Спатканне з прыродай

Калі ўжо сонейка ўстала і можна было напіцца пахучага травой малака, пайшла я ў сваё тайнае месца, якое знаходзіцца недалёка ракі і лесу. Умыўшы твар у рацэ глянула я ў неба і ўбачыла чараду дзікіх качак. Такое не заўсёды можна ўбачыць. Яны ляцелі цэлым статкам на поўдзень, з вялікім шумам. Я села на траве і пастанавіла хвіліну адпачыць. Заглядзелася на плынь вады і мне здавалася, што я плыву разам з ёю. Такое ўражанне надаваў лёгкі вецер. Па абодвух берагах рэчкі — на лугах, пасвіліся каровы і коні. На палях ужо расцвіў малачай, з якога я звіла вянок на галаву. Ідучы дамоў я пачула цудоўны спеў птушак. Гэты спеў развесяліў маю душу і напоўніў энергіяй, якая мне спатрэбіцца на заўтрашні дзень. Вось якую карысць прыносіць сустрэча з прыродай.

Наталля Жураўль,
І кл. Гімназіі ў Орлі

Польска-беларуская крыжаванка № 23

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 19: Клад, ікра, май, сіла, сейф, ціс, Ян, бляск, параход. Сям'я, кмен, рай, кайф, бор, дзіця, ліс, каскад.

Узнагароды — аўтаручкі — выйгралі: **Малгажата Харкевіч**, **Уля Рашкоўская** з Нарвы, **Міраслаў Арабчук**, **Дам'ян Мартынюк** з Новага Корніна, **Эмілія Саўчук** з Орлі, **Пётр Герасімюк** з Арэшкава. Віншуем!



Мой першы экзамен

8 і 9 мая г.г. ва ўсёй Польшчы ў трэціх класах гімназій адбыўся тэставы экзамен. У нашай гімназіі да экзамену прыступіла трыццаць вучняў. Яго мэта — праверыць веды вучняў і ўмеласць карыстацца імі на практыцы, а таксама параўнаць узровень навучання з іншымі школамі.

Першага дня адбыўся экзамен па гуманістычных прадметах. Для мяне ён прайшоў даволі добра. Тэст паказаўся лёгкім, таму што я многа рыхтавалася. Другога дня было цяжэй. Многа праблемаў стварылі пытанні па фізіцы і хіміі, але і тут спадзяюся добрых вынікаў. Кожны вучань стараўся напісаць тэст як найлепш, каб далей вучыцца ў „школе сваіх мараў”.

На нашых экзаменах у камісіі сядзелі дзве асобы звонку і тры з нашай школы. Вынікі гэтых экзаменаў будуць вядомыя 16 чэрвеня.

Юліта Якубоўская,
III „б” кл. Гімназіі ў Орлі

Ад рэдакцыі: „Зорка” жадае як найлепшых вынікаў, і каб усе нашы чытачы дасталіся ў „школу сваіх мараў”.

„Рамонка” з Ласінкі — Гран-пры

„Непаседы” з Камянца (Беларусь)

Беларуская песня 2003

З песняй лягчэй жыць на свеце

24 мая ў Гайнаўскім доме культуры адбыліся цэнтральныя элімінацыі конкурсу „Беларуская песня 2003” для вучняў пачатковых школ і гімназій, у якіх вядзецца навучанне беларускай мовы. У іх прынялі ўдзел 23 салісты, 6 дуэтаў і тэрцэтаў ды 12 вакальных і вакальна-танцавальных калектываў ды адзін хор (разам звыш 200 асоб). Агляд працягваўся больш за чатыры гадзіны. Выканаўчы ўзровень падсумавала журы: Юстына Пажэзінская (старшыня), Гражына Валкавыцкая і Мікалай Мяжэнны (члены).

Конкурс і адначасова канцэрт адкрылі бурмістр Гайнаўкі Анатоль Ахрыцюк і страшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі. Старшыня паінфармаваў, што Беларускае грамадска-культурнае таварыства конкурсы беларускай песні для дзяцей і моладзі ладзіць ужо трыццаць гадоў. За падрыхтоўку школьнікаў да іх падзякаваў настаўнікам і інструктарам музыкі і дадаў, што вельмі цешыць факт усё большага зацікаўлення конкурсамі як з боку вучняў, так і настаўнікаў, дырэктараў школ, інструктараў музыкі і дырэктараў дамоў культуры. Бо ж, як вядома, з песняй лягчэй жыць на свеце. Дзеці і моладзь у песнях знаходзяць радасць. Беларуская песня — спеўная мова душы. Сёлетні песенны агляд вялі Наталля Лемеш і Міхал Яліннік — вучні Агульнаадукацыйнага ліцэя з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы. І не абы-як, але спраўна, вопытна, на добрым узроўні.

Гран-пры сёлетняга конкурсу заваяваў хор „Рамонка” з Ласінкі (Нарваўская гміна). Атрымаў ён узнагароду старшыні Галоўнага праўлення БГКТ.

У катэгорыі салістаў: з 0-Ш класаў першынство заваявала Агата Гаўрылюк з Пачатковай школы н-р 6 у Беластоку (узнагарода дырэктара Гайнаўскага дома культуры), а другое месца заняла Оля Маліноўская таксама з Беластокай ПШ н-р 6. Вылучэнні атрымалі Мілена Каральчук з другога класа ПШ у Нараўцы і Эвеліна Бурнос з трэцяга класа ПШ у Рыбалах; у дуэтах з 0-Ш класаў: першае месца заняў дуэт Дарыя Семянюк і Настка Стахвюк з нулявога класа Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку (былі яны наймалодшымі ўдзельніцамі песеннага конкурсу) і атрымаў ён узнагароду старшыні Павятовага праўлення БГКТ у Гайнаўцы, другое месца — Юстына Давідзюк і Крыстыян Бурнос з ПШ у Рыбалах ды вылучэнне — дуэт Эмілія і Паўліна Багацэвіч (сёстры) з ПШ у Орлі; у катэгорыі IV-VI класаў — Юльянна Дораш з бельскай „тройкі” заняла першае месца (узнагарода бурмістра Гайнаўкі), Эва Шаранос з ПШ н-р 3 у Бельску-Падляшскім — другое месца, ды Эдыта Русіновіч з Орлі і Паўліна Капытка з Кленікаў — трэцяе месца; у дуэтах IV-VI класаў журы першага месца не прызнала, а другое заняў дуэт Анна Пост і Эдыта Русіновіч з ПШ у Орлі.

Дзявочы калектыў Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы

У катэгорыі гімназічных класаў сярод салістаў найлепш адрэкамендавала сябе Амелія Горбач з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы (узнагарода старасты Гайнаўскага павета), другое месца падзялілі Юстына Вышкоўская з Ягуштова і Магдаліна Чыквін з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы, вылучэнне атрымалі салісткі Ірміна Леанюк і Юліта Назарка, абедзве з Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы. Сярод дуэтаў гімназістаў пераможцам стаў дуэт Магдаліна Чыквін і Анна Сянкевіч з Гімназіі з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы.

З вакальных і вакальна-танцавальных калектываў у катэгорыі 0-VI класаў пачатковай школы пераможцам стала „Журавінка” з Бельска-Падляшскага, а два калектывы з Орлі атрымалі вылучэнне.

Сярод гімназічных вакальных калектываў першынство заваяваў калектыў з Ягуштова, другое месца „Гама” з Чыжоў, трэцяе — „Калінка” з Залукаў. Вылучэнне атрымалі „Ручай” з Дубіч-Царкоўных і калектыў з Гімназіі н-р 2 у Гайнаўцы.

Сярод хораў журы не прызнала першага і другога месцаў. Трэцяе месца заняў дзіцячы хор з Орлі.

Варта дадаць, што сёлета школьнікі лепш выбіралі творы з багатага песеннага рэпертуару і дапасоўвалі іх да сваіх выканаўчых магчымасцей. Таму, між іншым, узровень сёлетняга конкурсу быў высокі.

Пасля конкурсу, у 17 гадзін у ГДК пачалося культурна-забаўляльнае мерапрыемства „Дзеці — дзецям”. Найперш спявалі свае любімыя песні лаўрэаты конкурсу „Беларуская песня 2003”, а затым дзеці, іх бацькі і настаўніцы з Самаўрадавага прадшколля н-р 14 у Беластоку выступілі з абрадавай сцэнкай „Хрысціны”. Было цікава ўбачыць і паслухаць гэты народны абрад.

Усім вельмі спадабаўся канцэрт у выкананні вакальна-танцавальнага маладзёжнага ансамбля „Непаседы” з Камянца (Беларусь). Прайшоў ён у вельмі прыемнай цёплай атмасферы. Асабліва ўразіла і зачаравала слухачоў адна з „зорачак” калектыву — 10-гадовая таленавітая Волечка Сацюк.

Тэкст і фота Янкі Целушэцкага

„Зялёная, шалёная, пагодная душа”

16 мая г.г. мы мелі сапраўдны ўрок талерантнасці, які арганізавалі нашы настаўніцы. Мы сустрэліся з бельскім мастаком Тадэвушам Лучаем, інвалідам, па клічцы Крутус (маці калісьці яго так называла).

Упершыню мы, Бася і Кася, звычайныя дарастаючыя дзяўчаты, якія яшчэ нямнога бачылі і перажылі, дзіўна адчувалі сябе ў гэтай вельмі нетыповай для нас сітуацыі. Спецыяльна ўбіліся мы ў канец залы — там заўсёды больш бяспечна. Сядзелі пры адчыненым акне. Нёсся з яго прыемны пах, які цудоўна спалучаўся з мастацкім талентам нашага госця, які на нашых вачах вырэзваў душка ў кары таполі. Найбольш запамяталіся нам словы мастака, што ён ніколі не чапае долатам жывога дрэва. Заўсёды раней даведваецца, дзе ссякаюць дрэвы. Так засталося па сённяшні дзень. Разьбяр расказаў нам цікавую і рамантычную гісторыю аб 100-гадовай таполі. Мы пераканаліся, што ён патрапіць уваскрасіць памерлую душу дрэва. У такі спосаб узнікла „дзіця” мастака — душак „Хо-хо”, які заклікае людзей не крыўдзіць прыроду. І мы згодны з ім!

Тадэвуш Лучай — таксама вандроўнік. Цяпер ён больш падарожнічае, чым у час, калі быў здаровы. Дзякуючы гэтым падарожжам пазнаёміўся ён з многімі людзьмі з розных краін. Яго жыццёвы дэвіз — дзякуй за тое што маеш! Думаем, што тады намнога лягчэй жыць і нават інваліднасць не зможа забраць сэнс жыцця. Як гаворыць Тадэвуш Лучай, кожны чалавек нясе свой крыж. Мастак падкрэслівае, што заўсёды трэба нешта рабіць. Сустрэча з мастаком усведаміла нам некалькі спраў. Можа будзем больш разумець і шанаваць лёс нашага сучаснага свету.

Бася Жэрунь, Кася Козак,
III „ц” кл. Гімназіі н-р 3 у Бельску-Падляшскім

Фота ЛЕНЫ ГЛАГОЎСКАЙ

Батарэі — месца масавых расстрэлаў. Другі справа кс. Роберт Кшывіцкі

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Уваскрасенская царква і помнік князю Барысу

Камяні князя Барыса

У Барысаве, на месцы старажытнага замка, стаіць турма. У старой частцы горада знаходзіцца дом, у якім кватараваў Гітлер. Яшчэ іншым турыстычным атракцыёнам горада з'яўляюцца г.зв. *батарэі* — месца перамогі рускіх войск над Напалеонаўскай арміяй. У гонар пераможцаў саветы ўстанавілі бетонны помнік.

Тут таксама месца масавых расстрэлаў, якія з 1919 па 1933 год праводзілі бальшавікі. У памяць ахвяр сталінізму нельга паставіць хрысціянскі крыж.

* * *

Сучасны Барысаў знаходзіцца па правым беразе ракі Бярэзіны.

Ля Уваскрасенскай царквы новы помнік легендарнаму заснавальніку горада, князю Барысу. Да князя (з анёлам-ахоўнікам і каменем) цягнуць турысты. Усе фатаграфуюцца (дзеці абавязкова ўзлазяць на валун), а пасля ідуць гуляць па горадзе. Для постсавецкага турыста няма цікавасці заглянуць у царкву ці касцёл.

Гораду 900 гадоў — чытаем надпісы на гарадскіх аўтобусах. Першую звестку знаходзім пад 1127 годам у Лаўрэнціеўскім летапісе. Барысаў — умацаваны горад Полацкага княства. Названы ў гонар унука Усяслава Чарадзея, які праславіўся паходамі на яцвягаў і камянямі, якімі значыў заваяваны шлях хрысціянства.

— Два месяцы раней нас наведаў прэзідэнт, — ганарацца ў Барысаве.

— Усё ясна! — думаем уголас. Ужо з першага погляду горад нам здаўся „падазроным". Гладкія тратуары, адрамантаваныя і памаляваныя будынкі, каляровыя клумбы — усё гэта напамінала агульнадзяржаўныя акцыі ў Шклове і Міры.

* * *

Месца напаўняецца сэнсам, калі думаеш пра людзей. У Барысаве мы пазнаёміліся з ксяндзом Робертам Кшывіцкім. Ксёндз быў адзінай асобай, якая з ходу загаварыла па-беларуску.

Акалічнасці знаёмства не менш сенсацыйныя:

— Ці не скажаце, дзе тут ксёндз жыве? — запынілі на вуліцы маладога чалавека з рукзачком Лена і Вячаслаў.

Фота з архіва Р. КШЫВІЦКАГА

Раней нам сказалі пра беларускія багаслужбы ў касцёле.

— Я — ксёндз, — адказаў сімпатычны прахожы.

— А-а, вы з Варшавы? — пыталіся мы ўсе ашарашаныя.

— Так, з Варшавы.

Каб развеяць сумненні, ксёндз загаварыў яшчэ па-польску.

На парафіі з 1992 года. Меў прапанову служыць у Ватыкане, але рашыўся на Беларусь. Тут магчымасці, можна зрабіць шмат карыснага.

Ксёндз Роберт таксама журналіст — супрацоўнічае з беларускімі рэлігійнымі выданнямі.

* * *

Святар пакінуў свае абавязкі, каб паказаць нам горад. Экскурсію пачынаем з наведання магілы ксяндза Віктара Шутовіча (1890-1960). Магіла беларускага змагара і супрацоўніка „Крыніцы" знаходзіцца на гарадскім могільніку ля самой капліцы. На крыжы беларускі надпіс лацінкай.

На месцы гутарым пра сітуацыю беларускай мовы ў касцёле. У Барысаве 4-5 тысяч католікаў, у нядзелю прыходзіць да 500 асоб. Ксёндз арганізуе даклады моладзі. Пра гісторыю, пра культуру. Прапаведвае па-руску:

— Чаму парафіяне не хочуць беларускай мовы? — задумоўваецца ксёндз Роберт. — Бо не хочуць ніякіх змен.

— To są ludzie bez ojczyzny w sercu, — дадае.

— А як успрымаюць вашы даклады?

— Заўсёды збіраецца група 30-40 маладых людзей, — адзначае. Можна гаварыць пра каталіцкі беларускі рух. Пры парафіі дзейнічае 20 скаўтаў, якія прымаюць удзел у незалежніцкіх мітынгах.

* * *

Наведваем *батарэі* — земляныя фартыфікацыйныя збудаванні для абароны рускіх войск напярэдадні айчыннай вайны 1812 года, на правым беразе Бярэзіны. Месца пазначанае бетоннай скульптурай-аграмадзінай і яго ўпадабалі мясцовыя вандалы. Расхлёбанай, бетоннай лесвіцай падымаемся на гару.

Сярод сасновага лесу безыменныя магілы ахвяр сталінскага тэрору. Ніхто не ведае, колькі закапаных пад соснамі людзей. Вядома толькі, што расстрэлы пачаліся ўжо ў 1919 годзе.

— На Дзяды дзеячы БНФ паставілі тут бярозавы крыж,— успамінае ксёндз, — прыйшло пад 200 асоб. Аднак крыж, з бел-чырвона-белымі стужкамі, неўзабаве прапаў.

Аглядаем архіўныя здымкі. На дошцы надпіс: *Ведайце!!! Тут з 1919 па 1933 год адбываліся масавыя расстрэлы мірных жыхароў г. Барысава і раёна.*

— На кожным кроку сустракаем акцэптацыю сталінізму, — канстатуе ксёндз.

* * *

На развітанне з горадам мы выкупілі ўсю беларускую прэсу. Шчасліўцам стаў Вячаслаў, які захапіў адзіны тут нумар „Нашай Нівы".

Барысаў — цэнтр раёна. Пражывае ў ім 150 тысяч жыхароў. У горадзе вырабляюцца часці для трактароў. Да вайны быў важным яўрэйскім цэнтрам. Дзейнічала 17 сінагог, у цэнтры захаваліся многія пасляяўрэйскія будынкі. Нам не пашанцавала сустрэць хаця б адзін яўрэйскі акцэнт.

Ганна Кандрацюк

У чаромхаўскай бібліятэцы

Чаромхаўская бібліятэка змяшчаецца ў будынку Гміннага асяродка культуры. Працуе па аўторках, чацвяргах, пятніцах і суботах ад 10 да 18 гадзіны. Загадчыкам з'яўляецца Марыя Заборская, шматгадовая і прафесіянальная бібліятэкарка.

У мінулым годзе зарэгістраваных было 5 314 наведвальнікаў, у тым ліку 645 сталых чытачоў. Гмінная бібліятэка з'яўляецца адзінай установай у гміне, якая займаецца распаўсюджваннем чытальніцтва. Даўней працавалі бібліятэчныя пункты. Зараз няма ахвотных іх весці.

Бібліятэка налічвае 17 955 кніжак на польскай, беларускай і рускай мовах. У мінулым годзе бібліятэка купіла 483 кніжкі за суму 9 157 зл. Апрача гэтага прыватныя спонсары падарылі 1 040 найменняў. Частку перадала Гайнаўская бібліятэка са збору ліквідаванай бібліятэкі ў Нязнаным Бары. Найбольшую калекцыю падарылі спадарства Шпілеўскія (брат з сястрой) — 800 кніжак, настаўніца-пенсіянерка Яніна Скок — 150, Тамаш Сасноўскі — 70 і дваццаць раманаў з серыі „Harlequin" спадарыня Шабалоўская.

У мінулым годзе на прэсу было адведзена 1 906,30 зл. Афармлена гадавую падпіску на 29 часопісаў і газет. Найбольшы выбар маюць жанчыны і моладзь. Прэсу можна чытаць на месцы і пазычаць дамоў. У бібліятэцы знаходзяцца часопісы з галіны сельскай гаспадаркі, медыцыны і рэлігіі.

Асноўную частку чытачоў складаюць пенсіянеры і беспрацоўныя. Варта адзначыць, што часцей „заглядаць" у кніжку пачала чаромхаўская моладзь. Гітам была кніжка „Harry Potter". Студэнтаў і школьную моладзь цікавіць папулярна-навуковая літаратура.

Бібліятэка арганізуе выстаўкі выдавецкіх навінак, фатаграфій Адама Вайрака, супрацоўнічае са школай і садком, арганізавала конкурс мастацкага чытання, у якім удзельнічалі 52 дэкламатары.

Уладзімір Сідарук

Даўгабуд

У бясконцасць цягнецца будова Беларускага музея ў Гайнаўцы. Многія задумваюцца, чаму музей не працуе, шукаюць прычын склаўшайся сітуацыі. Вядома, вінаватыя людзі. Відаць, не стала адпаведнага чалавека, які закончыў бы пачатую Канстанцінам Майсенем справу.

Узначальваць Грамадскі камітэт пабудовы музея павінен чалавек з адпаведнай менеджэрскай падрыхтоўкай. У час сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў вопыту старшыні невялікага каператыва недастаткова.

Пакуль што ў камітэце пабудовы няма ідэі, плану адносна будучыні музея. Не выспела яшчэ думка, што музею патрэбны дырэктар. Час ужо закончыць пабудову і арганізаваць сапраўдную музейную дзейнасць.

У нас няма перашкод, каб было лепш. Справа не толькі ў фінансах. Праблемы і перашкоды ствараем сабе самі, робім з сябе пакутнікаў. Нам трэба спяшацца вылазіць з балота, бо як кажуць у народзе: „Нас няма і для нас няма".

У нас ёсць адукаваная моладзь, багатая духам і розумам, якая ведае замежныя мовы, з менеджэрскай падрыхтоўкай. Моладзь хоча працаваць, але будаўнікі музея гэтага не жадаюць. Ад нас адышлі і далей адыходзяць самыя лепшыя дзеячы-будаўнікі. Адзін з іх, Кастусь Майсеня, у час апошняй сустрэчы сказаў мне:

— Музею ўжо даўно патрэбны дырэктар, малады, адукаваны чалавек. Кіраванне музеем пенсіянерамі гэта страта часу. Сённяшнія ўладальнікі музея павінны зрабіць тое, што ў свой час зрабіў славуты Бонек, значыць, падаць у адстаўку.

Здаецца, што мой суразмоўца не памыляецца.

Віктар Бура

Поспехі беларускіх хораў

На Міжнародным фестывалі „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" перамаглі беларускія хоры. Побач лаўрэата, Дзяржаўнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г. Цітовіча з Мінска першыя месцы занялі Кафедральны маладзёжны хор прыхода св. ап. Пятра і Паўла з Мінска (катэгорыя прыхадскіх гарадскіх замежных хораў) і Народны маладзёжны хор „Вяснянка" з Гродна (катэгорыя акадэмічных хораў). Спецыяльную ўзнагароду атрымаў Кафедральны хор прыхода Апекі Божай Маці з Гродна.

Членамі хору прыхода св. ап. Пятра і Паўла з'яўляюцца студэнты вышэйшых навучальных устаноў Мінска. Хор дзейнічае з 1996 года, а апошні яго састаў узнік у 2002 годзе. Дырыжорам з'яўляецца студэнтка Духоўнай школы з Санкт-Пецярбурга Наталля Мядзведзь. Харысты з Мінска выступалі з дабрачыннымі канцэртамі ў вышэйшых навучальных установах і ў час сустрэч праваслаўнай моладзі. На VII Міжнародным фестывалі праваслаўнай музыкі ў Мінску атрымалі дыплом першай ступені. Штодзень спяваюць у сваёй прыхадской царкве. Ахвотна карыстаюцца творамі класікаў царкоўнай музыкі — Дзмітрыя Бартнянскага, Аляксандра Архангельскага і Паўла Часнакова. У свой рэпертуар уключаюць таксама царкоўныя творы сучасных кампазітараў — Наталлі Калеснічэнкі і Марыі Кутыравай.

— Стараемся спяваць дынамічна і з кантрастамі, захоўваючы адначасна малітоўнасць царкоўных песень, — заяўляе дырыжор Наталля Мядзведзь.

Усе царкоўныя песні харысты спяваюць на царкоўнаславянскай мове. Аднак у царкве св. ап. Пятра і Паўла ў Мінску раз у месяц адбываюцца багаслужэнні на беларускай мове.

Народны маладзёжны хор „Вяснянка" існуе з 1992 года пры Дзяржаўнай педагагічнай калегіі ў Гродне і выконвае, перш за ўсё, свецкую музыку. Члены хору спяваюць сучасныя і народныя беларускія песні. Сярод царкоўных песень выконваюць класічныя творы і сучасную царкоўную музыку. У калектыве больш за 50 чалавек, але ў Гайнаўку прыехала 40 асоб. Дырыжорам хору з'яўляецца Таццяна Перасадзька, якая закончыла Беларускую музычную акадэмію ў Мінску. Хор з'яўляецца лаўрэатам конкурсаў „Студэнцкая вясна" і „Новыя імёны", здабыў таксама III узнагароду на Фестывалі праваслаўнай музыкі Гродзенскай епархіі.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Маладзёжны хор прыхода св. ап. Пятра і Паўла з Мінска

Кафедральны хор прыхода Апекі Божай Маці з Гродна ўзнік у 1993 годзе. Спяваюць у ім людзі розных прафесій. У іх рэпертуары знаходзяцца творы беларускіх кампазітараў — Туранкова і Бутома. У 2001 годзе харысты здабылі ўзнагароду на Фестывалі праваслаўнай музыкі ў Мінску, а ў 2003 годзе ўзнагароду на Фестывалі праваслаўнай музыкі Гродзенскай епархіі.

Аляксей Мароз

Бельскі шпіталь у калапсе

Бельская Павятовая ўправа мае цяжкі для выканання бюджэт на гэты год, а віна за ўзніклыя абставіны ўскладваецца на папярэднюю ўправу.

Прыняты 31 сакавіка г.г. бюджэт прадбачвае 32 087 275 злотаў прыходаў і 34 535 467 зл. расходаў; дэфіцыт складзе 2 614 473 злоты.

Як вынікае з дакументаў старостваа, вельмі складаную сітуацыю бюджэту паглыбляе (апрача пагашання ранейшых задоўжанасцей) фінансавы калапс бельскага Павятовага шпіталя. У адносінах да гэтай установы не прымаліся ніякія меры дзеля дастасавання яго структуры да прынцыпаў дамоў з касамі хворых. Брак рашучых мер з боку ранейшай Управы павета давёў да цалкавітай затраты фінансавай здольнасці шпіталя. Такія абставіны прымушаюць сёння дырэкцыю да нялёгкіх рашэнняў, м.інш. да скарачэння занятасці.

Павятовы шпіталь у Бельску-Падляшскім працуе з 23 снежня 1961 года і спачатку налічваў шэсць аддзелаў. У 1997/98 гадах стаў ён Самастойнай публічнай установай аховы здароўя. З канцом мінулага года ў шпіталі працавала 414 асоб: 191 медсястра, 86 адміністрацыйных і паслуговых работнікаў, 59 урачоў і 18 асоб вышэйшага персаналу (фармацэўты, аналітыкі, рэабілітанты, тэолагі, псіхолагі). Большасць персаналу (354 асобы) складаюць жанчыны.

Фінансавыя абставіны шпіталя вельмі складаныя. У мінулым годзе дзейнасць шпіталя завяршылася дэфіцытам у 3 528 950 злотаў (годам раней дэфіцыт склаў 3 958 900 зл.); шпіталь задоўжаны на 7 576 910 злотаў.

У ліку прычын, якія спарадзілі такія жудкія абставіны, была бяздзейнасць ранейшай Павятовай управы, якая не наглядала за працай шпіталя, і празмерна размашыстыя непрадуманыя рамонты: заміж правесці іх на Аперацыйным аддзяленні, якое з'яўляецца найважнейшым тамашнім звяном, рамантавалі Гінекалагічнае аддзяленне. Чарговай прычынай узнікнення фінансавай няздольнасці было неабмяжоўванне коштаў дзейнасці пры зменшаным забеспячэнні з кас хворых, асабліва абыякавасць дырэкцыі да належных персаналу падбавак „203 злотаў". Адчайныя працаўнікі падалі іскі ў суд, выйгрываючы справы, а судовыя секвестратары прымянілі прымусовыя спагнанні. Адсутнасць фінансавай здольнасці адмоўна паўплывала на забеспячэнне шпіталя ў матэрыялы, лякарствы, харчы, электраэнергію, ваду і г.д.

Пра напраўчыя дзеянні ў шпіталі гаварылася на 6-ым пасяджэнні Рады павета. У сваім выступленні новая дырэктар шпіталя Бажэна Гратовіч сказала м.інш.:

— Мэтай дзейнасці ў першым перыядзе будзе затармажэнне росту задоўжанасці аж да зраўнання выдаткаў з прыходамі; у наступным этапе мусяць быць выпрацаваны большыя ад расходаў прыходы. Гэта неабходна, бо сёння няма ілюзій — пагашэння шпітальных даўгоў не будзе.

Усім, аднак, трэба ўсвядоміць, што шпіталь чакае працяглая беражлівая палітыка дзеля выраду з фінансавага калапсу. Гэта, бадай, найбольшае прадпрыемства ў павеце, а і яго грамадская роля важная. Наша бяднеючае грамадства будзе патрабавала ўсё больш медыцынскай дапамогі, а і ўсё часцей людзям не хапае на лячэнне ў клінічных і ваяводскіх цэнтрах.

Міхал Мінцэвіч

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Іконы выкананыя румынскімі дзяцьмі і моладдзю

Цэрквы, іконы і паломнікі

У час Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі" ў Гайнаўскім доме культуры адкрыты былі выстаўкі макетаў драўляных цэркваў, фатаграфій храмаў і здымкаў зробленых паломнікам. У ніжняй царкве Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы арганізавана была выстаўка ікон.

Макеты цэркваў выканаў Ян Францкевіч. Жыве ён у Беластоку і займаецца выконваннем макетаў гістарычных будынкаў. Самым цікавым макетам з'яўляецца мініяцюрная копія царквы Праабражэння Гасподняга з вострава Кіжы, распаложанага на Анежскім возеры (Расія). Была яна збудавана з сасновых бярвенняў, без прымянення цвікоў. Макет царквы зроблены з 12,5 тысяч невялікіх элементаў і дэталёва паказвае выгляд праўдзівага храма. Побач знаходзіцца макет царквы Васілія Блажэннага ў Маскве. Ян Францкевіч прадставіў таксама копіі іншых замежных цэркваў і храмаў з Міхалова, Мілейчыч і капліцы з Орлі. Перад выкананнем макетаў рабіў ён фатаграфіі святыняў, знаёміўся з іх гісторыяй і асаблівасцямі. Стараўся вельмі дакладна прадстаўляць на макетах выгляд гістарычных будынкаў. На выстаўцы прадстаўлены таксама фатаграфіі цэркваў выкананых Францкевічам. Побач іх экспануюцца здымкі з праваслаўных паломніцтваў, якія выканаў Гжэгаж Дамброўскі. Сярод іх многа фатаграфій з пешаходных паломніцтваў на Святую Гару Грабарку.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Макет царквы Праабражэння Гасподняга з вострава Кіжы

У вялікім калідоры ГДК знаходзяцца фатаграфіі цэркваў з Гайнаўскага і Кляшчэлеўскага дэканатаў, якія выканаў Ежы Вуйцік. Можна ўбачыць на іх драўляныя і мураваныя святыні, будаваныя некалькі стагоддзяў таму і новыя храмы, збудаваныя на працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў.

Вялікім зацікаўленнем карысталася выстаўка „Іконы з сэрца дзіцяці", напісаныя дзяцьмі і моладдзю з Румыніі, плён конкурсу арганізаванага Румынскай праваслаўнай царквой.

Аляксей Мароз

Некаторыя факты з гісторыі бежанства беларусаў Падляшша ў 1915-1916 гг.

Першая сусветная вайна, якая распачалася 1 жніўня 1914 г., вельмі хутка закранула беларускія землі. З аднаго боку тут праходзіла лінія фронту з 1915 па 1918 гады. А з другога боку яна выклікала маштабныя дэмаграфічныя працэсы: у першую чаргу эвакуацыю і бежанства насельніцтва. Па падліках беларускага гісторыка Віталя Карнялюка, агульная колькасць бежанцаў з пяці губерняў — Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай — на сярэдзіну 1918 г. складала каля 2 мільёнаў чалавек. Па-рознаму складаліся лёсы гэтых нешчаслівых людзей. Вельмі красамоўна аб бежанстве распавядаецца на старонках зборніка *Бежанства 1915 года*, выдадзенага ў 2000 г. у Беластоку. Сваёй невялікай нататкай мы плануем толькі дадаць новыя факты да ўжо вядомых, нагадаць шэраг прозвішчаў людзей, якія мусілі пакінуць свае сялібы, і ўцякаць за тысячы вёрстаў на ўсход, хто пад прымусам, а хто запалоханы. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне ўдалося выявіць адзін з тысячаў спіскаў бежанцаў, якія перасяліліся ў цэнтральныя рэгіёны Расіі. *Список беженцев, осевших в Хмелевской волости Козловского уезда Тамбовской губернии* быў складзены ў чэрвені 1916 г., сярод якіх была пэўная колькасць сем'яў з сучаснай Беласточчыны.

Хмелеўскае валаснае праўленне паведамляла ў Гродна: „Беженцы прибыли 13 и 14 сентября и 2 и 4 октября 1915 г. По их словам, покинули свои места 14-15 августа. Осели они в домах крестьян на квартирах. Со дня первоначального прибытия и до 1 декабря 1915 г. им выдавался паёк по 20 копеек в день на человека. С 1 декабря 1915 — на 1 человека 7 руб. 50 коп в месяц; на 2-х — 12 руб.; на 3-х — 17 руб.; на 4-х — 22 руб.; на 5-х — 26 руб.; на 6-х — 30 руб. и т.д. прибавляя по 4 руб. на человека. Провизия не выдаётся; одежду и обувь получали самые нуждающиеся, но не все; за квартиру платили из пайка по 1 руб. за человека в месяц. Поляки получили одежду и обувь, но кого Комитета правлению неизвестно".

Сярод бежанцаў Гродзенскай губерні сустракаем наступныя прозвішчы з вёсак і мястэчак Беласточчыны. Усе яны пазначаны ў спіску як праваслаўныя.

Вёска Янова Кленіцкай воласці Бельскага ўезда:

1. Усевалад Клімавіч Федарук — 40 гадоў з сям'ёю: жонка Любоў — 40 год; дзеці: Домна — 18 год, Аляксей — 16, Цімафей — 12, Мікалай — 8, Марыя — 7, Андрэй — 2; маці Марыя — 70.

2. Філіп Давыдавіч Пучко — 34 гады з сям'ёю: жонка Праскоўя — 32, дзеці: Наталля — 13, Фёкла — 9, Сцяпан — 6, Анна — 1.

3. Канстанцін Паўлавіч Ільяшук — 50 год з сям'ёю: жонка Матрона — 50, дзеці: Марыя — 20, Вера — 17, Тарас — 11, Мікалай — 0,5.

4. Кірыл Севасціянавіч Антасюк — 53 гады з сям'ёю: жонка Ефрасіння — 46, дзеці: Людміла — 23, Домна — 20, Яўген — 19, Вольга — 14, Анна — 12, Карніл — 7, Іван — 3,5, Еўдакія — 0,5; сястра Саламея.

5. Нікіфар Восіпавіч Ляшчынскі — 53 гады з дзяцьмі: Аляксандр — 12, Ксенія — 17 год.

6. Венядзікт Паўлавіч Анапюк — 56 год з сынам Венядзіктам — 17 год.

Вёска Градочна Кленіцкай воласці Бельскага ўезда:

1. Кірыл Архіпавіч Назарук — 50 год з сям'ёю: жонка Марфа — 40, дзеці: Даніл — 12, Анісія — 7, Уладзімір — 4.

Вёска Катлы, Відаўскай воласці Бельскага ўезда:

1. Лявонцій Іванавіч Янкоўскі — 50 год з дочкамі: Еўдакія — 22, Марыя — 20.

Вёска Чэхі Дубяжынскай воласці Бельскага ўезда:

1. Сцяпан Лукіч Астапчук — 49 год з сям'ёю: жонка Ефрасіння — 45, дзеці: Васіль — 14, Аляксандра — 9, Ульяна — 3.

Вёска Плёскі, Райскай воласці Бельскага ўезда:

1. Фёдар Сямёнавіч Туроўскі — 56 год з сям'ёю: жонка Фёкла — 40, дзеці Сцяпан — 19, Фёдар — 8.

Вёска Лысыя, Райскай воласці Бельскага ўезда:

1. Міхал Восіпавіч Корпач — 50 год з сям'ёю: жонка Елізавета — 42, дзеці: Грыгорый — 18, Надзея — 15, Любоў — 4, Андрэй — 1.

2. Якаў Аляксандравіч Корпач — 50 год з сям'ёю: жонка Анна — 50, дачка Любоў — 13.

3. Марцін Іосіфавіч Корпач — 36 год з сям'ёю: жонка Ірына — 30, дзеці: Анастасія — 9, Мітрафан — 4, Сцяпан — 2.

4. Аляксандр Іванавіч Корпач — 35 з сям'ёю: жонка Вольга — 34, дзеці: Мікалай — 11, Уладзімір — 9, Аляксей — 6, Іван — 3; сястра Клаўдзія — 20.

Вёска Дабрывада Бельскага ўезда:

1. Аляксандр Максімавіч Смык — 65 год з сям'ёю: жонка Фядося — 63, дачка Пелагея — 20.

Вёска Вялікія Слохі Сямятыцкай воласці Бельскага ўезда:

1. Ілья Пятровіч Юрчук — 52 гады з сям'ёю: жонка Марыя — 52, дзеці: Андрэй — 12, Анна — 13, Тамаш — 7.

2. Міхал Пятровіч Юрчук — 40 год з сям'ёю: жонка Марыя — 38, дзеці: Міхал — 18, Аляксандра — 16, Зоська — 14, Анна — 7, Юлія — 3, Марыя — 1.

3. Антаніна Фёдараўна Семянчук — 30 год з мамаю Таццянай — 60 год.

4. Марыя Ільіна Юрчук — 19 год.

Мястэчка Харошча Беластоцкага ўезда:

1. Надзея Рыгораўна Лянге з дзяцьмі: Уладзімір — 17, Аляксандр — 14, Мікалай — 11, Алена — 9.

Вёска Чараўкі Завыкаўскай воласці Беластоцкага ўезда:

1. Ілья Андрэевіч Врублеўскі — 48 год з сям'ёю: жонка Кацярына — 35, дзеці: Максім — 12, Любоў — 8, Уладзімір — 5.

Вёска Старая Грыбошўчына Астроўскай воласці Сакольскага ўезда:

1. Міхал Антонавіч Адамік — 41 год з сям'ёю: жонка Елізавета — 40, дзеці: Міхал — 17, Сцепаніда — 15, Марыя — 10, Сяргей — 8, Надзея — 5, Анна — 3.

Генадзь Семянчук

Царква ў Новай Волі

Вёска Новая Воля была заснава на пачатку XVIII стагоддзя і належала да ўладальнікаў Заблудава, фальварка Геранімова.

Царкву Нараджэння св. Іаана Хрысціцеля ў Новай Волі пачалі будаваць 26 верасня 1906 года. Была гатовая праз два гады. Асвяціў яе беластоцкі епіскап Уладзімір. Парафільнае свята вызначылі на дзень 24 чэрвеня старога стылю.

Царкву рамантавалі ў 1960 годзе. Настаяцелем быў тады а. Ян Кшэмінскі. Узначальваў ён парафію на працягу 20 гадоў.

Аднаўленне храма пачалі сёлетняй вясною. Памалявалі купалы, пакрыты бляхай дах. Яшчэ і цяпер ля царквы стаяць рыштаванні, драбіны. Можна ўбачыць маляроў за працай.

Тэкст і фота Янкі Целушэцкага

Злачынства і раскаянне

Чарговы ўспамін беларускага дзеяча Піліпа Кізевіча.

Была вясна 1944 г., апошняга года нямецкай акупацыі. Лінія савецка-нямецкага фронту праходзіла па рацэ Бярэзіне. На паўднёвай і ўсходняй Беласточчыне актыўна дзейнічала савецкая партызанка, на паўночнай і заходняй — польская партызанка. Адны яе атрады імкнуліся аслабіць нямецкую адміністрацыю, другія стараліся стаяць „z bronią u nogi", каб у адпаведны час сыграць сваю ролю ў вырашэнні польска-савецкіх адносін.

Аднойчы, у нядзелю вечарам, прыйшла да мяне польская настаўніца, пані М., з якой працаваў я ў савецкай школе: я ў беларускіх класах, яна — у польскіх. Пражывала яна як і я, па вуліцы Ветраковай. З ёю прыйшоў незнаёмы мужчына. Пані М. папярэдзіла мяне, што размова наша — тайная. Абое яны былі прадстаўнікамі Арміі Краёвай і рыхтаваліся выканаць план „Burza". План гэты прадугледжваў, што Армія Краёва, пасля адступлення немцаў, затрымае паход Чырвонай Арміі на польскія землі, а тым часам тылавыя польскія атрады завалодаюць урадавымі інстанцыямі, у якіх засядуць выйшаўшыя з падполля польскія чыноўнікі. Яна ведала, што я з'яўляюся актыўным беларусам, маю сувязі з беларускім асяроддзем, бо ў акцыю „Burza" трэба ўключыць і беларусаў, каб супольна выступіць супраць Чырвонай Арміі, уваход якой на цэнтральныя землі Польшчы пагражаць будзе існаванню польскай дзяржавы, або яе суверэнітэту. Я запытаў маіх размоўцаў: Дапусцім, што план „Burza" ўдасца выканаць і будзе адноўлена даваенная Польшча, ці вы зноў будзеце таксама прыгнятаць беларусаў і іншыя нацыянальнасці, як рабілася да вайны 1939? — „Nie, teraz będzie zupełnie inaczej i mniejszości narodowe otrzymają pełnię praw obywatelskich". Далей я ім сказаў, што нямецкая армія, хаця патрапана ў баях, прадстаўляе яшчэ значную сілу, мае танкавыя дывізіі, артылерыю і самалёты, аднак не дае рады затрымаць наступленняў Чырвонай Арміі, а вы хочаце затрымаць яе наступленне вашымі нешматлікімі, слаба ўзброенымі атрадамі? Гэта не ажыццявімая мара. „Czy myślicie, że ta wasza szkoła podchorążych, którą macie w Białymstoku, to taka wielka siła? — сказаў я. — „To pan i o tym wie?" — здзівілася пані М. У канцы я ўскіпеў і сказаў ім: А можа ўздоўж фронту паставіце голых баб на карачках і тады, мабыць, Чырвоная Армія спыніцца! Гэта мая з'едлівая іронія вельмі раззлавала маіх суразмоўцаў і яны, хлопнуўшы дзвярамі, пайшлі без развітання.

Прайшло крыху часу, але аб якой-небудзь значнай рэалізацыі плана „Burza" не было чуваць. 27 ліпеня 1944 г. Чырвоная Армія вызваліла Беласток ад нямецкай акупацыі. Мінуў тыдзень, а мая пані М. ізноў прыйшла да мяне — з другім мужчынам. Я прыняў іх у мансардзе. Яна села за стол, прадставілася мне як паручнік АК, выняла з кішэні паперу і стала мне чытаць смяротны прыгавор. Мужчына меў быць выканаўцам прыгавору. Але няпрошаныя госці не ведалі аб тым, што савецкія ўлады выдалі мне пісталет, бо я меў быць арганізатарам беларускіх школ. Выхапіў я з кішэні пісталет і скамандаваў: „Ręce do góry! Do domu marsz!" У дагонку я крыкнуў пані паручнік: „Pani M.! Nie ja panią zdradzę, a zdradzą panią pani podchorążowie". І праўда. Мінулі два тыдні, яна пайшла на спатканне з падпольнымі кадэтамі, а яны, ужо завербаваныя савецкімі органамі, схапілі яе пад рукі і здалі органам. Пані М. была вывезена ў СССР, як „апасны элемент на тылах Чырвонай Арміі".

Настаў 1946 год. Я аднойчы стаяў у чарзе ў прадуктовым магазіне па вуліцы Ліпавай і прыкмеціў, што адзін чалавек усё мне прыглядаецца. Падышоў ён да мяне і запытаў: „Czy Pan jest Filip Kiziewicz?" Я пацвердзіў. „Pozdrowienie z Ostaszkowa od Pani M. Ona prawie codzień opowiadała o Panu i to bardzo, bardzo w dobrych słowach". Прайшоў некаторы час і пані М. вярнулася ў Беласток. Яна ўвайшла ў свой дом, скінула плашч і — нават не з'еўшы абеду — прыбегла да мяне з пакаяннем. — „Panie Filipie", — звярнулася яна да мяне. — „Niech Pan zapomni i daruje naszą złośliwą podłość i naszą bezgraniczną głupotę".

„Я бачыў, — сказаў П. Кізеціч, — што ў душы пані М. наступіў агромны пераварот і яна хоча стаць парадачным чалавекам. Сэрца маё адлягло.

Гэту гісторыю П. Кізевіч расказаў мне ў 1979 г., калі пані М. не было ўжо ў жывых.

Мікалай Капчук

У сваёй хаце гаспадар

Рысь Грут з вёскі К. любіў прыняць гасцей. Як то кажуць пра такіх — душа не чалавек. Сам не вып'е, калі мае, і запрашае суседзяў. А калі каўтане, гатоў кожнага да грудзей прыціскаць, слязамі заліваецца. Гарэлка плача, не чалавек, але шчыра, ад сэрца. Ды скажы яму, што гэта толькі тая гара! Не! — і зрок не мутны ад яе, і розум светлы. Выпіўшы, бачыш лепей, бы чысты алкаголь змыў са свету ўсё шалупінне. „Ад вош, ад блох, ад усякіх тараканаў, ад дзевак заразных, ад людзей гразных, адыдзі, нячыстая сіла, застанься сам спірт!" — пагаварваў Рысь Грут, наліваў неабавязкова спірт, і шчыра прытуляў да грудзей тых людзей, якіх не лічыў за „гразных". Суседзяў, калег, тых, хто рабіў яго зямлю, якое меў шмат, а не з усёй спраўляўся, дык аддаваў у арэнду, каб не ляжала аблогай. Так сказаць, чалавек ён быў някепскі, да таго шчыры аж да болю. І шчырасці, сардэчнасці патрабаваў ад іншых. Бо ж і што нам засталося ў гэты цяжкі час! — хіба што адно сумленным ды шчырым быць у адносінах адзін да аднаго, бедалагаў... Вось, такая кумпанія — тыя на вярхах, а мы ўнізе таўчэмся, бы тая камарня.

Сонечны ліпень. Да Рыся Грута зноў прыйшлі калегі. Адзін прадаў свінчо, другі закалоў — і было што з'есці ды выпіць. А з кім? Як не з тым шчырым, пачцівым Рысем, які, калі людзі не маюць з кім пагаманіць, запрашае да сябе, сам частуе?.. Заехалі таксама Яўген і Валянціна Кнуты, каб прадоўжыць сваю арэнду. Заехалі на трактары. Пані Валянціна адмовілася ад пачастунку — яна ж кіравала машынай. Не спадабалася гэта гаспадару.

— Слухай, ты! Я да цябе, як да чалавека, баба ты дурная! Адмаўляешся? Я да цябе з сэрцам! — і схапіў арандатарку загрудкі. І хоць мажная была кабеціна, дасталася ёй крыху па клубах і спіне ад усхваляванага пана Рыся. Вырвалася, урэшце, ды выбегла на падворак. Ускараскалася на сядзёлка трактара і памчалася па пыльнай дарозе на свой хутар. Яўген, муж ейны, застаўся ў пана Рыся, частуючыся ад сэрца наліванай гарэлкай.

Вечарам малады сын Кнутаў Віця ўскочыў на трактар, падчапіўшы калёсы, і заехаў з калегам да пана Рыся на разборку. Трэба ж было забраць п'янага бацьку ды аблаяць хамулу за тое, што падняў руку на кабету.

Гэтага было замнога як на Рыся Грута. — Што за *бісовесныя* людзі з гэтых Кнутаў! — закрычаў на Віцьку, схапіў сякерку ды пачаў разбірацца — гупнуў Віцьку сякеркай у галаву. Замахнуўся і на ягонага калегу Яся, таму, аднак, удалося ўхіліцца і адняць ашалеламу гаспадару смяротную прыладу. Ясь кінуў сякеру ў кут, падхапіў закрываўленага Віцьку падпахі і павалок да суседа, каб выклікаць хуткую дапамогу.

Валянціна Кнут не магла ўседзець дома, чакаючы сына і мужа з разборкі. Урэшце рушыла пешшу з другім сынам Ігарам у бок гаспадаркі Рыся. Пад яго домам стаяў іхні трактар, а з шынаў валіў дым. Раптам з хаты выскачыў гаспадар, завішчаў і пачаў біць Ігара ў твар. Валянціна кінулася званіць на паліцыю.

Ахвяры Рыся ў шпіталі праляжалі па пяць дзён.

Пракурор абвінавачвае Рышарда Грута ў спробе забойства дзвюх асоб і знішчэнні трактара спадарства Кнутаў. Прызнаецца ён да таго, што атакаваў сякерай Віктара Кнута, але нязгодны з тым, што ўдарыў хлопца так, што той трапіў у шпіталь. І, кажа, не ён падпальваў трактар на сваім падворку. Пагражае яму зняволенне ад 8 да 25 гадоў, а нават і пажыццёвае.

Суседзі і добрыя сябры не могуць зразумець, як гэта ўсё здарылася. Рысь Грут жа ж — такі шчыры, добры, пачцівы хлопец, што і мухі не заб'е. І Валя, і Віця, проста, так, трапілі яму пад руку. Усё ад нерваў. Не маглі зразумець яго добрага сэрца. Ага, і таго трактара шкада.

Лукаш Правасуд
(*прозвішчы герояў зменены*)

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дырэктар Марыя Клімовіч і інструктар Яўгенія Казімярук каля мясцовых народных вырабаў

Захоўваюць мясцовыя традыцыі

У Гарадскім асяродку культуры ў Кляшчэлях ладзяцца выстаўкі мастацкіх прац і арганізуюцца сустрэчы з творцамі народнай культуры. Марыя Кісель з Палічнай прэзентавала свае вырабы з саломы. Прыязджалі жыхары вёсак, якія малявалі пісанкі. Арганізавалася выстаўка народных вырабаў. Сярод іх асаблівую ўвагу прыцягнулі вырабы з гліны, якімі ў мінулым праславіліся Кляшчэлі. У Кляшчэлях захаваліся вырабы апошняга ганчара Лявона Саласцюкевіча. ГАК плануе арганізаваць Рэгіянальны музей Кляшчэлеўскай зямлі, у якім будуць паказвацца народныя вырабы і вясковыя прылады працы. Улады ГАК намерваюцца падтрымоўваць Цэнтр рэгіянальнай аматарскай творчасці, які паказваў бы свае вырабы. Валянціна Ефімюк з Кляшчэляў і яе ўнучкі Малгажата і Іаанна Літвіновіч прэзентавалі свае гафтаваныя працы. Еўдакія Маркевіч з Дашоў вучыла выконваць кветачныя аздабленні да вербаў. Апошнім часам арганізавана была выстаўка жывапісных прац — плёну пленэру арганізаванага ў Драгічыне ў 2001 годзе. Некалькі разоў паказвалася разьба кляшчэлеўскага мастака Славаміра Смыка. Зараз прэзентуюцца карціны Аркадыюша Ражынскага з выявамі кляшчэлеўскіх помнікаў. З 1991 года выдаецца гмінная газета. Раней рэдагавала яе дырэктар Марыя Клімовіч, а сёння — інструктар Яўгенія Казімярук. У часопісе змяшчаюцца інфармацыі аб культурных мерапрыемствах, грамадскіх падзеях і працы Гарадской рады.

Самым вялікім і пастаянным мерапрыемствам у Кляшчэлях з'яўляюцца арганізаваныя летам „Дні Кляшчэлеўскай зямлі". Выступаюць у час іх калектывы, якія дзейнічаюць пры асяродку культуры і школе. На беларускай мове спяваюць інструментальна-вакальны гурт „Тырса" і калектыў „Гарчарочкі" з Кляшчэляў, „Каліна" з Дашоў і „Дабрывада" з Дабрывады. Вясной у Падставовай школе ў Кляшчэлях арганізуецца агляд школьных тэатральных калектываў, якія выступаюць на беларускай мове. У памяшканні ГАК інструктар Ігар Фіта вядзе заняткі ігры на піяніна, акардэоне, гітары і флейце.

Аляксей Мароз

Фільмавы вечар

Чэрвеньскія дні многія з нас прызначаюць на адпачынак. Пасля доўгай зімы патрабуем спакою, які напоўніць нас аптымізмам і добрай энергіяй. Каб паправіць настрой, прапаную пайсці ў кінатэатр.

„Ціхі амерыканец" — рамантычны трылер у рэжысуры Філіпа Нойса з Майклам Кейнам і Брэнданам Фрэйзерам у галоўных ролях спадабаецца аматарам жахлівых фільмаў. Дзея адбываецца ў Сайгоне, дзе спатыкаецца двух журналістаў: Томас — змучаны жыццём англічанін, палітычна неангажаваны назіральнік і Алдэн — малады амерыканец, які ў першы момант здаецца быць наіўным ідэалістам.

Паяўляецца прыгожая жанчына, якая не можа і папраўдзе не хоча выбраць аднаго з іх. Жыве з Томасам, потым пераносіцца да Алдэна, абяцае выйсці за яго замуж і раптам вяртаецца ў бардэль.

Аднак галоўная тэма фільма заключаецца не ў любві, а ў палітыцы. Аказваецца, што непрыкметны ідэаліст з'яўляецца агентам спецслужбаў, які плануе дзяржаўны пераварот, але... А што было далей, пабачце самі!

„Непераможны" аўтарства Уолтэра Хілі гэта прапанова для мужчын, якія час ад часу маюць ахвоту паглядзець добры баксёрскі матч. Фільм паказвае брутальны спорт з праявамі расізму, праблемы каляровых меншасцей без права на нармальнае жыццё.

У турму Світуотэр трапляе двух чэмпіёнаў боксу: адзін за забойства, а другі за гвалт. Калі паяўляецца магчымасць сарганізаваць баксёрскія спаборніцтвы, на рынгу даходзіць да крывавага сутыкнення, якое закончыцца... Як? Пабачце самі.

На экране пабачым такіх акцёраў як Уэслі Снайпс, Вінг Рэймс, Пітэр Фалон, Майкл Рукэр і Джон Сэда.

„Пракляты сезон" Рона Шэлтана гэта фільм прысвечаны жыццю паліцыянтаў з Лос-Анжэлеса. Дзея пачынаецца 3 сакавіка 1991 года, калі чатырох паліцыянтаў без ніякай прычыны забіла чорнага шафёра. Потым судовы працэс, прызнанне невіноўнасці забойцаў і хваляванні ў горадзе. Аднак гэта не з'яўляецца галоўнай тэмай фільма. На экране паяўляецца двое паліцыянтаў. Адзін, дасведчаны жыццём, алкаголік (у ролі Курт Расэл), другі — малады ідэаліст (Скот Спідмэн), якія належаць да элітарнай паліцыйнай часткі, дзе карупцыя, наркотыкі гэта звычайная справа. Фільм паказвае, як выглядае сапраўднае жыццё большасці амерыканскіх паліцыянтаў, для якіх законы не абазначаюць нічога.

На канец прапанова для аматараў коміксаў. Марк Стывен Джонсан перанёс на экран комікс „Смяльчак" аб невідучым адвакаце (у гэтай ролі Бэн Афлэк), які ноччу з'яўляецца тайным мсціўцам гарадскога зла. Ёсць і закаханая ў ім прыгожая дзяўчына (Джэніфэр Гарнэр) і сябры, якія нічога не падазраюць і моц спецыяльных эфектаў, выбухаў, пажараў...

Паўліна Шафран

Нараўка

Свята пагранічніка

У апошню нядзелю мая ў Нараўцы адбылося ўрачыстае святкаванне Дня пагранічніка. Са святам салдат павіншаваў войт Нараўчанскай гміны Мікалай Павільч. Далей у афіцыйнай частцы сустрэчы камандзір заставы паінфармаваў прысутных аб дзейнасці і навейшым тэхнічным аснашчэнні заставы. Некаторым наглядчыкам дзяржаўнай мяжы былі прысвоены вышэйшыя вайсковыя званні.

На нараўчанскай пагранзаставе з мастацкай часткай выступілі вучні Пачатковай школы ў Нараўцы. Пасля пагранічнікі паказалі, як працуе застава (тут еўрапейскія стандарты). На заканчэнне святкавання ўсіх пачаставалі вайсковым гарохавым супам. (яц)

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2003 r. upływa 5 czerwca 2003 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.

2. Cena prenumeraty na III kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.

3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.

4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Вуніі — так

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

— Чым розніцца любоў акадэмічная, турэмная і філасофская?

— Акадэмічная: ёсць з кім, але няма дзе; турэмная — ёсць дзе, але няма з кім; філасофская — ёсць з кім, ёсць дзе, ды, праўду кажучы, навошта?

* * *

У шатландскай бальніцы:

— Каго тут фактычна трэба аперыраваць? — пытае медсястру хірург.

— Гэтага чалавека. У час ігры ў гольф ён няўважліва праглынуў мячык.

— А гэты побач яго: нехта з сям'і?

— Не, гэта яго сапернік. Хоча іграць далей і чакае мячыка.

* * *

Непітушчы ксёндз дакараў распуснага вікарыя; той адказаў:

— Свяшчэннае Пісанне два разы згадвае пра піццё: адзін раз там гаворыцца пра віно, якое развесяляе сэрца чалавека, а другі раз пра ваду, якая заспакойвае прагу асла.

* * *

— Пан доктар, я думаю, што ганарар, які вы патрабуеце за вылячэнне майго сына ад вятранкі, залішне высокі.

— Я яго наведваў і абследаваў аж пяць разоў.

— Аднак вы не забывайце, што ён заразіў аж дзесяць сваіх сяброў.

* * *

У псіхіятра:

— Прыйшоў я да вас, пан доктар, у справе маёй жонкі, якая ад некалькіх месяцаў лічыць сябе палівачкай для кветак.

— Гэта сур'ёзны казус. Але чаму вы прыходзіце з гэтым толькі цяпер?

— Бо ўчора аддаў мне яе са свайго прысядзібнага ўчастка сусед.

Адгаданка

					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — прыказку.

1. канчатковае звальненне з вайсковай або дзяржаўнай службы = 26 __ 27 __ 16 __ 17 __ 18 __ 19 __ 3 __ 4 __;

2. тонкі слой ледзяных крышталяў, які ўтвараецца на ахалоджанай паверхні дзякуючы выпарэнням = 34 __ 1 __ 2 __ 5 __;

3. аўтамабіль або механізм, які ператварае адзін від энергіі ў другі = 23 __ 24 __ 8 __ 28 __ 13 __ 12 __;

4. вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі, уладаннямі = 29 __ 7 __ 31 __ 30 __;

5. доўгае паглыбленне выкапанае ў зямлі або моцны працяглы крык некаторых жывёл = 11 __ 10 __ 15 __;

6. тлушчавае адкладанне ў целе жывёльнага арганізма = 6 __ 14 __ 25 __ 20 __;

7. пара, калі сеюць = 36 __ 37 __ 35 __ 21 __ 32 __;

8. гучанне мовы або сіла голасу = 9 __ 22 __ 33 __; (ш)

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 16 нумара

Два, верш, вітка.

Рашэнне: **Віктар Швед**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

У пошуках моцы

Прыслала мне мая Агата ліст. Палітычны. Кажа, у той Амерыцы знаёмыя французы да яе чапляюцца. Жартам кажуць, што цяпер яна багацейка — мае кавалак пустыні з нафтай. Агата была супраць вайны з Іракам, злавалася на нашых чыноўнікаў разам з прэзідэнтам, што, не пытаючыся ў яе, паслалі ў Ірак нашых жаўнераў-хімікаў ды спецслужбы. Што быццам дзеля дэмакратыі, тлумачыцца цяпер перад тымі амерыканізаванымі еўрапейцамі (якія заўсёды еўрапейцамі застануцца ці хоць пачуваюцца, калі маюць свой стары еўрапейскі гонар і культуру), а не для таго, каб выйграць рука ў руку з мацнейшымі ды дапрасіцца свайго кавалка торта. Тлумачыцца Агата за ўвесь народ разам з ягонай уладай як ніколі не тлумачыўся Напалеон перад свабодалюбівымі вернымі палякамі, якіх выслаў на Гаіці, каб задушылі вызвольнае паўстанне тамашняга люду. Уяўляю сабе, як маёй Агаце цяжка за сусветную глабальную палітыку. З'ела б у тых французаў і жабы, калі б яе частавалі, каб толькі не гаварыць тамака пра тую палітыку, тым больш па-англійску або па-французску. Усё з амерыканскім акцэнтам! У сябе, у Беластоку, то мая Агата герой! Зрабіла б у гэтым свеце парадак! На міністра яе найменш, альбо ў Еўрапейскі парламент! О-то-то, вернецца, дык і запрапаную, каб у якія структуры ўключылася. Будзе ў хаце цішэй. А, можа, хай і ў той Амерыцы падзейнічае?.. Ай, ці не застарая? Усё ж, не цётка рэвалюцыі яна.

А нас ужо палітыка дастала. Мяне, Колю і Збышку. І не толькі адных нас. Толькі МакХолад корміцца гэтым, як каня кроплямі вады, разявіўшы дзюбу на ляту. Толькі яго хопіць загнаць пад тэлевізар, абкласці газетамі ці напусціць на якога міністра. А то павалачэцца куды з намі старымі, жыць не дасць сваімі роздумамі, прагнозамі ды прароцтвамі (здзяйсняюцца!), а ўвесь час яго сушыць. Калі п'е, дык хоць не гаворыць. Ды колькі ж можна маўчаць! А ў нас пенсіі невялікія... Ну, адправілі мы МакХолада ў Супрасль у музей да ягонае тоўстае сяброўкі, каб ёй галаву марочыў, а самі выбраліся ў пушчу. Колеў „Фіат” прарыпеў тых пару дзесяткаў кіламетраў, і знайшліся мы ў славутых месцах моцы.

— Набіраю сілы, набіраю моцы! — ускрыкнуў Збышка, прыліпшы да старажытнага дуба.

— Не набірайся больш чым трэба! — спалохаўся я з другога боку дрэва. — Ты і так мацук зрабіўся пасля жэньшэню ды вітаміну Q-10! Перацярэбіш усіх баб!

— А хоць і ўсе бабы Еўрасаюза! І худыя гаваркія насатыя нямкіні, і меланхалічныя англічанкі, і шырокабёдрыя галандкі! — крычаў, набіраючы моцы, Збышка Наскварка.

— І іспанкі гарачыя! — Коля Здунюк аж клаўся на шыпшыну, абрастаючую каменны круг былога язычніцкага свяцілішча. — І рослыя бландзіністы шведкі!

— Шведкі не хочуць еўра, чуў ты? — успомніў Збышка і адпусціў дуб з абдымкаў.

— І шведы таксама, — удакладніў я. — Не так ужо і салодка робіцца ў той Еўропе. Беспрацоўе, таго, рост цэнаў... Сялянам, можа, сваім даплаты забяруць...

— То на халеру я прагаласаваў за тую *Вунію!* — страпянуўся Коля ды сеў на святы паганскі камень.

— Давай, сядзем... — з крэктам апусціўся я на другі валун. — Падзейнічаем.

Вандал Арлянскі

Чапляюцца

— Ці я з незаконнага прыплоду? Чаго яны ўсе ад мяне хочуць?! — мядзведзь Сандар Жоржавіч нервова прахаджваў па паляне ў час чарговага сходу ўселяснога кіраўніцтва.

Мядзведзю выступіла была пена на губах ад злосці пасля таго, як загадалі яму сесці ў цяні на жратве ва Уладзімірскім лесе. Воўк Нятупін пасадзіў усіх пры самым карыце. Сандара — на імху пад бярозай так, каб ягоная лапа не даставалася да харчоў і ўсё мусіў прасіць прабачэння ў тых, хто пры карыце сядзеў.

— Якое ўніжэнне! Я ў нікога, ніколі не прасіў прабачэння, — мядзведзь з горыччу ўспамінаў перад кіраўніцтвам уладзімірскую бяседу. — Чаго я туды ўвогуле пашлэпаў!

Як на злосць, зноў цяўкнула лісіца Пута з Глабальнай міжлясной арганізацыі, мядзведжы дакор сумлення.

— Дайшло да мяне, што спадарыні зноўку штосьці ў нашым лесе перашкаджае, што, слухайце, наступныя выбары нашага кіраўніцтва пасля пабудовы хваёвай сцяны на захадзе і поўначы, слухайце, мусяць быць дэмакратычныя! Я пытаюся: якія, значыцца? Ці такія дагэтуль не былі? Ну, скажы, вавёрачка, ці я цябе не выбраў дэмакратычна?

— Ну... макратычна ты мяне выбраў, мядзведзь ты мой, — адказала Кацюша.

— А ты, дзік, друг ты мой! Недэмакратычнае тваё кіраўніцтва?

— Макратычнае, макратычнае. Качаўся я з любасцю ў гразі, і магу гэтак рабіць, колькі ўлезе.

— А ты, лань, аздоба кіраўніцтва?..

— Я, я, фактычна, дэматычна, кратычна.

— Ну, самі бачыце, — працягваў Сандар Жоржавіч. — А тыя залясныя ўсё чапляюцца нашых межаў. Не дам сабе ў мёд дзьмухаць. Выступлю з міжлясной рэзалюцыяй наконт ушанавання мядзведжых правоў. Калі тая лісіца Пута такая разумніца, дык хай мяне павучае, але ў рамках канвенцыі, а не сваёй лісінай хітрасці. Можа і Нятупін зразумее, дзе мядзведжае месца на жратвах.

Кіраўніцтва разбрылося па лесе. Сандар Жоржавіч застаўся адзін на паляне, загледжаны ў неба, выглядаючы знакаў лепшай міжлясной будучыні.

— Ну і чаго яны пайшлі. Мела ж быць дэмакратычнае галасаванне над маёй рэзалюцыяй. Як не, хай так і будзе. Галасаванне і так адбудзецца.

Мядзведзь згодна з міжлясными стандартамі абвясціў галасаванне.

— Хто за? Дзякую. Хто супраць? Дзякую. Хто ўстрымаўся пры галасаванні? Дзякую. Інфармую, што ніхто не быў супраць і пры маім устрыманым голасе рэзалюцыя перайшла.

Вяртаючыся ў сваю бярлогу, Сандар Жоржавіч тлумачыў у думках:

— Ну, то ж трэба было мне ўстрымацца, не мог жа ж я галасаваць „за”, як гэтага хацела маё каханае кіраўніцтва. Урэшце ж, дэмакратыя ёсць, так ці не.

МакХолад

ISSN 0546-1960